Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ВЕРАСНЯ 2017 г. СУБОТА №184 (28548)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пасля залпаў «Захаду»**

СТАР. 4



**Спяваць паэзію санскрыту - па-беларуску**

СТАР. 9



**Што за звер — качка інстытуцкая?**

СТАР. 12

# Добрых вам выхадных!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Праект Указа «Аб мерах па ўдасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці» прадугледжвае скасаванне ведамаснага кантролю і сыход ад сістэмы планавых праверак, у рамках якой наведаць суб'ект гаспадарання можна было нават пры адсутнасці парушэнняў з яго боку і без іншых важкіх прычын. Замест гэтага прапануецца ажыццяўляць выбарачныя праверкі, правядзенне якіх у дачыненні да прадпрыемства магчыма толькі пры наяўнасці комплексу падстаў (напрыклад, пры выяўленні неадназразовых парушэнняў). Пры гэтым характар праверкі зменіцца з карнага на прафілактычны. Уводзіцца і адказнасць «кантралёраў» за неабгрунтаваныя прад'яўленні патрабаванняў да суб'екта гаспадарання або правядзенне праверак у парушэнне патрабаванняў заканадаўства».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9366 | ▼ |
| Еўра | 2,3198 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0737 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Юбілей

## ГОЛАС, ЯКІ ЧУВАЦЬ У СВЕЦЕ

### На працягу стагоддзя газета «Звязда» застаецца зоркай беларускай перыёдыкі

**Свой стагадовы юбілей «Звязда» адсвяткавала 9 жніўня. Але дата своеасаблівая — такім працяглым, прычым бесперапынным жыццём не можа пахваліцца ні адно штодзённае выданне краіны. Пра гэта ўчора казалі і высокія госці на ўрачыстым мерапрыемстве, прымеркаваным да юбілею газеты.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Віншавальнае слова кіраўніка дзяржавы агучыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Валерый МІЦКЕВІЧ**. Таксама ён уручыў газеце Ганаровую грамату Адміністрацыі Прэзідэнта (на фота).

СТАР. 3

■ Еўрагульні. Чакаем разам!

**Анастасія МАРЫНІНА:**

## «Баскетбол 3х3 — гэта заўсёды відовішча»



**Баскетбол 3х3 — адзін з нямногіх гульнявых відаў спорту, што былі ўключаны ў праграму II Еўрапейскіх гульняў. Аранжавы мяч быў прадстаўлены і на I гульнях у Баку, некаторыя кажуць, што менавіта праз Азербайджан пралягаў шлях баскетбола 3х3 на Алімпійскія гульні. Бо ўжо ў 2020 годзе ў Токіа ён будзе прадстаўлены на Алімпіядзе. Як пройдзе турнір у Мінску у 2019 годзе, колькі зборных будзе намі прадстаўлена і якая арэна прыме займальныя гульні, расказала выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола Анастасія МАРЫНІНА.**

### 3 раніцы да позняй ночы

*— Зараз гэта адзін з тых відаў спорту, што развіваюцца найбольш хутка і паспяхова. На Алімпіядзе ў Токіа ён дэбютуе разам са скалалажаннем, скейтбордынгам і сёрфінгам. Чаму іх дадалі да алімпійскай праграмы? Гэта маладзёжныя субкультуры, здольныя адцягнуць падрастаючае пакаленне ад вуліцы і прыцягнуць да здаровага ладу жыцця,* — расказвае Анастасія Уладзіміраўна.

Сапраўды, баскетбол 3х3 становіцца ўсё больш папулярным у Еўропе, бо гэты від спорту вельмі дынамічны, напрыклад, у адрозненне ад класічнага баскетбола, дзе матч доўжыцца каля дзвюх гадзін, гульня 3х3 праходзіць за 25 хвілін.

СТАР. 12

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# МІНІМУМ ПРАВЕРАК, МАКСІМУМ АДКАЗНАСЦІ

## Прэзідэнт прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржкантролю

**У Палацы Незалежнасці працягваюць абмеркаванне пакета дакументаў па лібералізацыі бізнесу і разняволенні дзелавой ініцыятывы. Учора падчас рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанідам Анфімавым разглядаўся праект указа Прэзідэнта «Аб мерах па ўдасканаленні кантрольнай (нагляднай) дзейнасці».**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што да 1 кастрычніка ўсе дакументы, якія датычацца работы прадпрымальнікаў, бізнесу, павінны быць канчаткова разгледжаны і падпісаны.

— За выключэннем аднаго закона, які будзе разгледжаны ў першых чыслах кастрычніка, у пачатку работы нашага парламента, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Больш за ўсё гэтыя пытанні знаходзяцца ў полі зроку нашага бізнесмена. Гэта натуральна. Адказваць у нас хочуць па мінімуме, а свабоды — паболей. Нам ні ў якім разе нельга весціся, як модна сёння казаць, на гэтыя хітрыкі. Мы сапраўды павінны прыбраць усё лішняе, што перашкаджае рабоце людзей, прадпрыемстваў, але кантроль павінен застравацца.

У той жа час кантроль дзяржавы не павінен перашкаджаць бізнесу працаваць. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў рамках названага праекта Указа ўжо абмяркоўвалі пераход ад карнага ўхілу дзяржаўнай кантрольнай дзейнасці да прафілактычнай работы:

— Мы сыдзем ад планавых праверак, змесцім акцэнт на так званыя выбарачныя праверкі. Я заўсёды гэтага патрабаваў: правярайце каго хочаце, але ў вас павінны быць падставы. У вас павінны быць канкрэтныя прычыны таго, што вы прыйшлі на прадпрыемства да бізнесмена, фізічнай, юрыдычнай асобы. І калі такія падставы ёсць — калі ласка, ідзіце. Але калі вы прыйшлі, і гэтыя падставы не пацвердзіліся, вы павінны за гэта адказваць.

Прэзідэнт запатрабаваў, каб на гэта была звернута асаблівая ўвага.

— Ніякіх пралазаў быць не павінна, — заявіў ён.

Наступны падыход да арганізацыі кантрольнай (нагляднай) дзейнасці — гэта скарачэнне колькасці падстаў для назначэння пазапланавых праверак.

— Мы таксама дамаўляліся пра тое, што правяраць будзем толькі тады, калі ўзбуджана крымінальная справа. У нас зараз практыка такая: з'явіліся нейкія матэрыялы, да крымінальнай справы ідуць праверачныя мерапрыемствы праваахоўных органаў, яны звяртаюцца да вас з даручэннямі, просьбамі — маўляў, давайце будзем правяраць гэтага суб'ект гаспадарання. Не. Узбудзілі крымінальную справу — яна ўжо на кантролі — вось тады і правярайце. Тады можна пракантраляваць работу і праваахоўных органаў, і работу кантралёра, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ёсць пытанне з прыпыненнем дзейнасці — часовай ці пастаяннай — таго ці іншага суб'екта гаспадарання.

— Мы дамовіліся пра тое, што гэта не справа кантралёраў, — адзначыў беларускі лідар. — Вы павінны пакласці на стол перад кіраўніком прадпрыемства, бізнесменам канкрэтныя прэтэнзіі. І ён няхай вырашае: працаваць яму ці лепш прыпыніць работу.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што была дамова: кантралёры таксама павінны несці пэўную адміністрацыйную адказнасць.

— Трэба, каб у гэтым нарматыўна-прававым акце падобная адказнасць была прапісана, — удакладніў кіраўнік краіны. — Няхай гэта будзе нейкі першы крок у гэтым кірунку, але ўсё ж такі яны павінны адчуваць сваю адказнасць. Натуральна, не перанапружваючы кантралёраў. А то мы зараз адаб'ём не тое, што ахвоту, мы ў кантралёраў увогуле ўсялякае жаданне працаваць можам адбіць падобнымі мерамі. Але адказнасць павінна быць ва ўсіх — у тым ліку ў кантралёраў.

Яшчэ адно пажаданне кіраўніка краіны датычылася аптымізацыі пераліку кантрольных органаў і сфер іх дзейнасці.

— Вы — кантралёр, вы — дзяржаўны чалавек, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Вы павінны выключыць усё лішняе, усё, што перашкаджае, і нават паглядзець наперад... Але ні ў якім разе вы не павінны «лібералізавацца» да такой ступені, што мы згубім кіруемасць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# КАБ РАСЛА ТРАНЗІТНАЯ ПРЫВАБНАСЦЬ

## Падчас рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы са старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрыем Сянько абмяркоўвалася павышэнне транзітнай прывабнасці нашай краіны

— Дакладваюць амаль неверагодныя лічбы: амаль на трэць павялічылася колькасць перамяшчаемых і грузаў, і людзей. Відаць, гэта так, але што гэта нам дае? Гэта вельмі важна, каб і людзі разумелі, — адзначыў кіраўнік краіны.

Яго таксама цікавілі нюансы работы мытных органаў:

— Перш за ўсё аўтаматызацыя на мяжы. Каб не было да нас прэтэнзій, што чэргі вялікія і гэтак далей... Ці ўдасканальваем мы гэтую работу па кантролі на мяжы і пропуску гэтых жа тавараў, фізічных асоб і транспарту? У якім стане ў нас тут знаходзяцца справы? — пацікавіўся Прэзідэнт.

Наступнае пытанне, што закраналася падчас сустрэчы, — незаконнае перамяшчэнне забароненых тавараў. У прыватнасці, асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў, наркотыкаў, зброі, радыеактыўных рэчываў. Так, беларускія пагранічнікі, мытныя органы пільна сочаць, каб забароненае не трапіла праз нашу тэрыторыю ні на Захад, ні на Усход:

— Як мы даводзім гэта да нашых партнёраў на Захадзе? Яны ж цудоўна разумеюць, што вязуць — туды. Мы тут ловім, затрымліваем... Ці бачаць яны нашу ролю ў гэтай справе?

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся таксама ў старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта, як ідуць работы па ўдасканаленні пунктаў пропуску, пунктаў перамяшчэння цераз мяжу.

Юрый Сянько ўручыў кіраўніку дзяржавы першы экземпляр новага Мытнага кодэкса Еўразійскага эканамічнага саюза, дзе сабраны ўсе міжнародныя пагадненні, якія сёння працуюць у рамках краін — удзельніц «пяцёркі».

Беларускі лідар спытаў, наколькі гэты Мытны кодэкс адпавядае нашаму жыццю. Прынамсі, дакумент распрацоўваўся для пяці дзяржаў.

— Натуральна, там былі пэўныя кампрамісы, — канстатаваў Прэзідэнт. — Наколькі гэтыя кампрамісы не адпавядаюць нашым інтарэсам?

Юрый Сянько паведаміў, што ў новым Мытным кодэксе ЕАЭС улічаны патрэбы розных айчынных міністэрстваў і ведамстваў, якія адказваюць за работу эканомікі, а таксама інтарэсы бізнес-асацыяцый, якія таксама працавалі над складаннем гэтага кодэкса.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### ❍ У ТЭМУ

**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта**, у размове з журналістамі звярнуў увагу на тое, што павышэнне транзітнай прывабнасці Беларусі і стварэнне камфортных умоў для бізнесу сёлета ўжо дазволілі павялічыць адлічэнні ў бюджэт амаль на 250 млн долараў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Дзяржаўны мытны камітэт выконвае прагнозныя паказчыкі па зборы плацяжоў у бюджэт на 100%.

— Усё гэта стала магчыма дзякуючы таму, што транзітная прывабнасць Беларусі стала лепшай, работа бізнесу — больш камфортнай. І сумарна ўсе гэтыя аспекты далі магчымасць у тым ліку павялічыць сабраныя плацяжы, бо вялікія аб'ёмы тавараў апрацоўваліся на тэрыторыі нашай краіны, — падкрэсліў Юрый Сянько.

### ■ На прыёме

# Жыццё рэгіёна з першых вуснаў

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ правёў прыём грамадзян у Петрыкаўскім райвыканкаме.**

Цэнтральнымі пытаннямі прыёму сталі такія бытавыя аспекты, як няякасны рамонт даху і прыватызацыя жылля. Акрамя таго, абмяркоўвалася незаконнае звальненне грамадзян. Усе звароты грамадзян былі ўзятыя пад кантроль.

На думку Максіма Рыжанкова, выязныя прыёмы паказваюць, як працуе мясцовая ўлада. Праблема кожнага чалавека заслугоўвае пільнай увагі, бо менавіта чалавек з яго правамі і інтарэсамі з'яўляецца галоўнай каштоўнасцю нашай дзяржавы, упэўнены намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. «Выязныя прыёмы дазваляюць убачыць, чым жыве краіна. Гэта добрая магчымасць зрабіць аналіз таго, што адбываецца ў грамадстве, якімі праблемамі жыве той ці іншы рэгіён і, адпаведна, зрабіць выснову аб рабоце органаў мясцовай улады», — дадаў ён.

Нагадаем, што напярэдадні Максім Рыжанкоў правёў прыём грамадзян у Жыткавіцкім раёне. Акрамя асабістых сустрэч з людзьмі, ён наведаў шэраг сацыяльных і турыстычных аб'ектаў, установы адукацыі, а таксама асобныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■

## УВАГА: ПРАМАЯ ЛІНІЯ

**Усё, што вы хацелі даведацца аб працоўным праве**

Свае пытанні вы зможаце задаць, патэлефанаваўшы на прамую лінію гасцям рэдакцыі «Звязды» — юрыстам, **галоўнаму прававому інспектару працы Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысе Васілеўне МАНЮК і галоўнаму прававому інспектару працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сафіі Васілеўне ГРЫШУЦІНАЙ.**

Тэлефануйце **25 верасня з 11.00 да 13.00** па тэлефоне **8 (017) 287-18-71**.

Папярэднія пытанні можаце даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.

### ■ Год навукі

# ЗАКЛЮЧНЫ АКОРД

**Адсутнасць у нашай краіне нобелеўскіх лаўрэатаў і намінантаў на гэту прэстыжную прэмію старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ тлумачыць сціпласцю беларусаў.**

— Я лічу, не трэба быць такімі сціплымі, неабходна заяўляць пра сябе ў поўны голас. Так, гэта няпростая працэдура, трэба фарміраваць вялікі пакет дакументаў, заручыцца падтрымкай навукоўцаў і ў ЗША, і ў Еўрасаюзе. Але гэта трэба рабіць. Паверце, нам ёсць чым ганарыцца і што прадставіць сусветнай навуковай супольнасці, — паведаміў на сустрэчы з журналістамі Уладзімір Гусакоў.

У пачатку снежня ў Мінску пройдзе II з'езд вучоных Рэспублікі Беларусь. Плануецца, што з'езд будзе праходзіць на працягу двух дзён. Удзел у ім возьмуць 2100 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны. Чакаецца прыезд вялікай колькасці вядомых навукоўцаў з Расіі, іншых краін СНД, замежных акадэмій навук, сусветных навукова-даследчых арганізацый і цэнтраў. Дэлегаты і запрошаныя госці прымуць удзел у пленарным пасяджэнні. Яно пройдзе ў Палацы Рэспублікі. Чакаецца, што ў другі дзень работы з'езда са зваротам да беларускіх вучоных выступіць кіраўнік дзяржавы. У рамках з'езду будуць працаваць 9 секцый, прысвечаных асноўным напрамкам развіцця навукі і міжнароднаму супрацоўніцтву. Прадугледжана таксама арганізацыя работы секцыі «Моладзь у навуцы».

2017 год аб'яўлены ў Беларусі Годам навукі і правядзенне з'езду стане яго выніковым мерапрыемствам, так бы мовіць, заключным акордам. Мяркуецца, што на з'ездзе будуць вызначаны асноўныя, найбольш актуальныя, задачы і напрамкі развіцця навуковай сферы на далёкую перспектыву, выпрацаваны генеральная стратэгія развіцця айчыннай навукі ў эканоміцы, мадэль новай эканомікі, канцэпцыя доўгатэрміновай навукова-інавацыйнай бяспекі краіны.

Так, на разгляд дэлегатаў будзе вынесены дакумент пад назвай «Стратэгія: навука і тэхніка 2030—2040», работа над якім зараз вядзецца. «Ён вызначыць развіццё навукі і эканомікі Беларусі на цэлыя 10 гадоў: якой павінна быць навука, каб развівалася эканоміка краіны, і якой павінна стаць эканоміка ў працэсе інтэграцыі з навукай, — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў. — Свет сёння знаходзіцца на парозе новай прамысловай рэвалюцыі пад назвай «індустрыя 4.0». Мы таксама павінны развівацца ў гэтым кантэксце. Ствараюцца воблачныя тэхналогіі, дзякуючы якім чалавек можа рэгуляваць, кіраваць, атрымліваць інфармацыю, а гэтыя тэхналогіі адначасова яе апрацоўваюць і даюць яму рэкамендацыі. Мы рухаемся да інтэлектуалізацыі грамадства, калі будзе стварацца вытворчасць без людзей на базе кіравання праз інтэрнэт рэчаў. Цяпер мы гаворым ужо не толькі пра інтэрнэт рэчаў, а пра інтэрнэт усяго, калі чалавек, напрыклад, дома можа кіраваць тым, што адбываецца ў офісе, адначасова працаваць з банкам па сваіх рахунках, працаваць з медыцынскімі ўстановамі, сэрвісам сацыяльных паслуг. І гэта не фантастыка, а недалёкая будучыня...

Адзін з найважнейшых дакументаў, над якім сёння таксама вядзецца работа, указ кіраўніка дзяржавы аб павышэнні заробкаў вучоных. Па словах старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, плануецца даць кіраўнікам навуковых арганізацый права на дыферэнцыяцыю аплаты працы навуковых работнікаў.

— Калі сёння ўсё даволі строга ў гэтым плане рэгламентавана, то ўсе абмежаванні будуць зняты. І кіраўнік зможа, напрыклад, на вучоным савеце прыняць рашэнне аб істотнай дыферэнцыяцыі аплаты працы работнікаў нават у адным падраздзяленні, у адной лабараторыі, нават калі тыя займаюць аднолькавыя пасады, — падзяліўся папярэдняй інфармацыяй Уладзімір Гусакоў. — Усё будзе залежаць ад выніковасці іх працы, ад прыцягнутых срокаў, прычым заробак можа адрозніваецца ў два-тры разы...

Старшыня Прэзідыума НАН звярнуў увагу і на пытанне аплаты працы маладых вучоных. «Мы павінны прыцягваць таленавітых маладых людзей у навуку. Мяркуем, што гэты ўказ паспрыяе замацаванню ў навуцы таленавітай моладзі», — дадаў ён.

Плануецца, што ўказ будзе прыняты да II з'езду вучоных Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

# ГОЛАС, ЯКІ ЧУВАЦЬ У СВЕЦЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— 100 гадоў газета крочыць поруч з дзяржавай, побач з беларускім грамадствам, дапамагаючы ствараць не толькі культуру, навуку, адукацыю, — адзначыла **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**. — «Звязда» дапамагала краіне ваяваць, аднаўляць разбураную падчас вайны гаспадарку. І ў суверэннай Беларусі газета мае свой адметны голас, які, дзякуючы сучасным інфармацыйным тэхналогіям, чуваць далёка ў свеце.

Калектыў выдання віншавалі не толькі вядомыя дзяржаўныя дзеячы, кіраўнікі і намеснікі шматлікіх арганізацый, устаноў, прадстаўнікі кузні творчых кадраў, у тым ліку і для «Звязды», Інстытута журналістыкі БДУ. Каб сказаць роднай газеце на роднай мове шмат добрых слоў, прызнацца ў любові, у сталіцу прыехалі і нашы партнёры з рэгіёнаў. Віншавалі — хто прозай, хто вершамі. Неслі падарункі, кветкі, а самае галоўнае — было бачна, што для многіх з іх «Звязда» з'яўляецца любімай газетай.

Для **дырэктара выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзіміра АНДРЫЕВІЧА** яна больш чым любімая: не адно дзесяцігоддзе працы ў рэдакцыі яго назаўсёды параднілі з газетай. «Што ўвесь час адрознівала «звяздоўцаў», журналістаў, якія хіліліся да газеты, дык гэта рамантызм, — прызнаўся колішні намеснік рэдактара «Звязды». — Менавіта рамантыкі ў 1917 годзе зрабілі рэвалюцыю. У пэўным сэнсе глыбокія рамантыкі і адказныя людзі выпускалі «Звязду» ў падполлі і ў партызанскай зоне. Калектыў газеты шчыра і вельмі актыўна ўключыўся і ў стварэнне, а таксама ў развіццё суверэннай Беларусі».

Калегі з іншых СМІ шчыра казалі, што «Звязда» — месца, дзе хочацца працаваць. Гэта газета, у якой хочацца вучыцца.

— Чытаю сучасную «Звязду»: часам радуюся, а часам бянтэжуся, магу і паспрачацца, — падзяліўся ветэран рэдакцыі, **першы намеснік рэдактара газеты на працягу двух дзесяцігоддзяў Міхаіл МІХАЕВІЧ**, які заўсёды на сувязі са сваімі вучнямі. — Сёння працаваць у беларускамоўным выданні вельмі цяжка. Быў нават такі час, калі на рэдкалегіі ўзнімалася пытанне аб пераходзе газеты на рускую мову. Мы тады аднагалосна прагаласавалі супраць. На шчасце, сучаснае пакаленне журналістаў не здраджвае традыцыям, якія на працягу доўгага часу ствараліся іх папярэднікамі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

## ■ Я зноў выбіраю «Звязду»

### «Разгортваеш вашу газету — і быццам нешта светлае сыходзіць у сэрца»

**Наталля Мікалаеўна Вашкевіч, пенсіянерка, жыхарка Светлагорска:**

— Я ўжо шмат часу жыву ў Светлагорску. Але нарадзілася і вырасла ў вёсцы. Там усе размаўлялі па-беларуску, я вучылася ў беларускамоўнай школе. Тут, у горадзе, ужо чыстай беларускай мовы не пачуеш, а шкада. За тое я і цаню «Звязду» — за цудоўную нашу мову. Разгортваеш вашу газету — і быццам нешта светлае сыходзіць у сэрца. Хораша робіцца на душы!

Я чытаю «Звязду» ўжо амаль дваццаць гадоў. Апошнім часам з цікавасцю ўспрымаю матэрыялы пра вёску. Там рэгулярна злабадзённыя тэмы падымаюцца. Ды мне і вельмі блізкія гэтыя рэаліі, хоць я даўно ўжо гараджанка, але ў такія хвіліны з замілаваннем успамінаю сваю вёсачку.

Вельмі падабаюцца артыкулы Алены Ляўковіч, заўсёды іх шукаю поглядам, як толькі разгортваю газету. Вельмі цікава піша, мы потым з сяброўкамі абмяркоўваем усё гэта. Пра сваіх равесніц люблю пачытаць, цікава даведацца, як людзі жывуць, а таксама, што ў свеце робіцца. Добра, што ў нас ёсць такая газета, блізкая і зразумелая сэрцу кожнага беларуса.

**Запісала Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by* ■

# БЕЛАРУСКІЯ МАШЫНЫ ХУТКА ПАРАЗУМНЕЮЦЬ?

## Айчынныя навукоўцы расказалі пра апошнія распрацоўкі ў галіне машынабудавання

**Беларускія навукоўцы пастаянна працуюць над развіццём тэхналогій, якія б зрабілі эксплуатацыю айчыннай тэхнікі больш эфектыўнай. Магчыма, вечны рухавік яны адкрыюць не хутка, але ім ужо ёсць што паказаць да прафесійнага свята машынабудаўнікоў (24 верасня). Па словах генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Сяргея ПАДДУБКІ, беларускія грузавікі неўзабаве могуць атрымаць на ўзбраенне новую тэхналогію — гібрыдны электрапрывод.**

Па словах вучонага, развіццё электрапрыводаў стрымліваецца высокім коштам батарэі. Але выйсце ёсць у пераходнай версіі гэтай тэхналогіі — гібрыдным прыводзе, калі на аўтамабілі ўсталёўваецца адначасова і рухавік унутранага згарання, і электрычны прывод. «Гібрыдны транспарт актыўна развіваецца ва ўсім свеце, і наш інстытут таксама працуе ў гэтым кірунку. Мы распрацавалі гібрыдны модуль, які можа быць усталяваны, напрыклад, на грузавік. Мы гатовыя ўкараняць гэтую распрацоўку», — растлумачыў ён.

Вучоны таксама лічыць, што сінтэз дзвюх тэхналогій мае значныя перавагі. Гібрыдному транспарту не патрэбна інфраструктура, таму што падзарадка адбываецца адразу на борце. Ёмістасць батарэі там значна меншая, яна выступае як буфер, які спажывае энергію пры тармажэнні і спуску з горак. Акрамя таго, адбываецца значная эканомія паліва пры ўстаноўцы гібрыднай тэхналогіі — 20—30%.

Але на пераасначшэнні тэхнічнага боку аўто сёння распрацоўкі ва ўсім свеце не спыняюцца. Усе паступова пераходзяць да «ўкаранення мазгоў» у транспартныя сродкі. Беларускія навукоўцы імкнуцца не адстаць ад мэйнстрыму. Мы маем намер стварыць кластар пад назвай «Інтэлектуальны электратранспарт», — паведаміў Сяргей Паддубка. У Аб'яднаным інстытуце машынабудавання НАН ёсць цэнтр, які займаецца бартавымі інтэлектуальнымі сістэмамі. Там добра ведаюць, якімі тэмпамі неабходна рухацца да развіцця беспілотных тэналогій. Першы крок — укараненне інтэлектуальных сістэм дапамогі кіроўцу. «Нашы навукоўцы таксама працуюць у гэтым кірунку», — запэўніў гендырэктар інстытута.

Таксама Сяргей Паддубка анансаваў дату выхаду ў свет першай малагабарытнай камунальнай машыны — інавацыйнага праекта, які распрацоўваецца сумесна з Мінгарвыканкамам. Паводле яго слоў, першы доследны ўзор будзе гатовы да канца 2017 года. Праект ужо знаходзіцца на стадыі завяршэння.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## ■ Справы грамадскія

# Будучыня — за маладымі

### Для прафесійнага развіцця моладзі неабходна стварацьь камфортныя ўмовы

**Такое меркаванне выказаў намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Сяргей ПІГАРАЎ на круглым стале на тэму «Ад вытокаў дзяржаўнасці да IT-краіны», які прайшоў у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

— Можна колькі заўгодна казаць пра тое, што наша моладзь не павінна з'язджаць з Беларусі, аднак сітуацыя наўрад ці зменіцца, пакуль не будуць створаны ўмовы для камфортнага развіцця, — лічыць Сяргей Пігараў. — Але важна адзначыць, што сёння ў нашай краіне робіцца ўсё, каб гэтыя ўмовы з'яўляліся.

На яго думку, у будучыні цалкам рэальная сітуацыя, калі беларуская моладзь будзе адпраўляцца за мяжу па прафесійны вопыт, аднак потым вяртацца і рэалізоўвацца ў Беларусі. Дапамога ў гэтай сферы з'яўляецца таксама адной з прыярытэтных задач «Белай Русі», дадаў намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання.

У працэсе падрыхтоўкі да трэцяга З'езду аб'яднання, які адбудзецца 28 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі, удзельнікі «Белай Русі» актыўна вывучаюць працэсы ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і духоўнай сферах сучаснага беларускага грамадства. У рамках гэтай работы арганізацыя праводзіць шэраг круглых сталоў у Мінску, Гродне, Гомелі, Магілёве і Брэсце на базе прадпрыемстваў і вышэйшых навучальных устаноў. Акрамя саміх членаў «Белай Русі» на сустрэчах прысутнічаюць дэпутаты парламента, прадстаўнікі мясцовай улады, прафесары і выкладчыкі, супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і проста неабыякавыя грамадзяне.

У фармаце круглых сталоў у кожнага ёсць магчымасць выказацца і прапанаваць сваю ідэю ў любой сферы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Лідар Паўночнай Карэі палічыў заяву Трампа аб «знішчэнні» КНДР абвяшчэннем вайны



Кім Чэн Ын адрэагаваў на словы Дональда Трампа аб тым, што ЗША могуць «цалкам знішчыць» Паўночную Карэю. Амерыканскага прэзідэнта ў сувязі з гэтым ён назваў «шалёным махляром», а яго словы палічыў «аб'яўленнем вайны».

Заява прэзідэнта ЗША Дональда Трампа аб тым, што Штаты могуць «цалкам знішчыць» Паўночную Карэю, з'яўляецца «трызненнем вар'яцкага махляра», якое «цяпер уражвае ўвесь свет». Так словы амерыканскага кіраўніка інтэрпрэтаваў паўночнакарэйскі лідар Кім Чэн Ын, тэкст яго заявы прыводзіць агенцтва ЦТАК.

Выступленне Трампа, як заўважыў Кім Чэн Ын, выклікае «глабальную заклапочанасць». «Спалоханы сабака брэша ўсё больш і больш», — лічыць Кім Чэн Ын, параўшы амерыканскаму прэзідэнту перад выступленнем на «сусветную аўдыторыю» «старанна выбіраць адпаведныя выразы».

«Псіхатычны гангстар — прэзідэнт ЗША — адкрыта кажа пра гатоўнасць цалкам знішчыць суверэнную дзяржаву», — адзначыў ён, выказаўшы здагадку таксама, што «неадэкватны» Трамп, які «пагражае ўсім народам і прымушае вар'яцець цэлы свет», безумоўна, павінен быць «хуліганам і парушальнікам парадку, а не палітыкам».

«Трамп адмовіўся ад міру і абразіў нашу рэспубліку, было зроблена самае абуральнае абвяшчэнне вайны», — заявіў Кім Чэн Ын. «Мы будзем сур'ёзна разглядаць адпаведныя звышцвёрдыя меры ў адказ», — дадаў ён.

### Кіраўнік МЗС Аўстрыі хоча арганізаваць саміт Пуціна і Трампа ў Вене

Нейтральная Аўстрыя можа стаць месцам правядзення перамоў паміж прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам і прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным аб выкліках у сучаснай міжнароднай палітыцы. Пра гэта заявіў аўстрыйскі міністр замежных спраў і дзеючы старшыня АБСЕ Себасцьян Курц напярэдадні выбараў у Нацыянальны савет Аўстрыі (ніжняя палата парламента).

«Я хацеў бы прапанаваць Трампу з прэзідэнтам Расіі Пуціным абмеркаваць на саміце ў нейтральнай Аўстрыі найважнейшыя выклікі міжнароднай палітыкі», — адзначыў Курц у адказ на пытанне Аўстрыйскага агенцтва друку, якую тэму ён хоча ўзняць у сваёй першай тэлефоннай размове з амерыканскім лідарам, калі па выніках выбараў у парламент стане канцлерам Аўстрыі.

### На помніку Калашнікаву выявілі чарцёж нямецкага аўтамата

У сацыяльных сетках разгарэлася чарговая спрэчка вакол помніка канструктару Міхаілу Калашнікаву, які быў адкрыты 19 верасня ў Мaskве. Як паведаміў на сваёй старонцы ў Facebook даследчык Юрый Пашалок, на помніку Калашнікаву замест АК-47 намаляваны чарцёж нямецкай аўтаматычнай вінтоўкі StG 44.

Скульптар Салават Шчарбакоў паведаміў РІА Навіны, што гатовы ўнесці змены ў помнік Міхаілу Калашнікаву, калі будзе даказана, што на ім намаляваны чарцёж менавіта нямецкай вінтоўкі. Пасля стала вядома, што пліту з чарцяжом прыбяруць з помніка.

«Мы хочам падзякаваць таму чалавеку, які заўважыў гэты чарцёж на помніку, і адразу паведамілі пра гэта скульптару Салавату Шчарбакову. Ён зараз знаходзіцца на месцы і дэмантуе гэтую пліту, паколькі сапраўды, на думку спецыялістаў, гэта — схема нямецкай зброі», — паведаміў «Інтэрфаксу» выканаўчы дырэктар Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства Уладзіслаў Конанаў.

## ■ На слыху

# ДА ПОШУКАЎ ДАЛУЧЫЛІСЯ «БУСЛЫ»

**Па просьбе МНС супрацоўнікі НПЦ шматфункцыянальных беспілотных комплексаў Нацыянальнай акадэміі навук у ноч з 21 на 22 верасня з дапамогай беспілотных лятальных апаратаў «Бусел М40» далучыліся да пошукаў зніклага ў Белавежскай пушчы хлопчыка, паведамілі ў прэс-службе НАН.**

Падчас начных вылетаў былі выяўлены каардынаты шэрагу месцаў, дзе можа знаходзіцца прапаўшае дзіця. Гэта стала магчыма дзякуючы цеплавізарам, якія ўстаноўлены на беспілотніках. З ранку ратавальнікі пачалі абследаванне гэтых кропак. Пошукавыя работы працягваліся і ўдзень. Нагадаем, 10-гадовага хлопчыка шукаюць з суботы 17 верасня. Дзіця з вёскі Новы Двор Свіслацкага раёна ўвечары на веласіпедзе накіравалася ў лес у грыбы. Пакуль міліцыянерамі была знойдзена толькі двухколавая машына хлапчука...


onliner.by

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by* ■

■ Рэха падзеі

# «ЗАХАД-2017».





Фота Надзеі БУЖАН.

# ПОСТФАКТУМ

## Задачы сумеснага стратэгічнага вучэння выкананы на высокім узроўні

**Апошнія дні Беларусь зноў была ў эпіцэнтры ўвагі сусветнай супольнасці. Сумеснае стратэгічнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі, якое раз на два гады праводзіцца або на нашай тэрыторыі, або ў суседняй дзяржаве, сёлета выклікала вялікі грамадскі рэзананс. Прычым ажыятаж вакол «Захаду-2017» распачаўся яшчэ задоўга да вучэння...**

### ПАГРОЗЫ НЯМА

Некаторыя нашы суседзі чамусьці ўбачылі ў традыцыйных манеўрах рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі пагрозу іх тэрытарыяльнай цэласнасці. І гэта нягледзячы на тое, што, як і было заяўлена загадзя, вучэнне «Захад-2017» насіла выключна абаронны характар.

**«Баявая работа вялася ў радыёэфіры, у паветры і на зямлі — у комплексе гэта дазволіла паспяхова выканаць усе пастаўленыя задачы».**

У той жа час актыўнасць НАТА каля нашых межаў толькі расце. За апошнія восем гадоў колькасць вучэнняў у рэгіёне павялічылася ўдвая, а склад войскаў, задзейнічаных у вучэннях Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавора, за гэты ж перыяд вырас больш чым у тры разы. Калі ў «Захадзе-2017» удзельнічала каля 12,7 тыс. ваеннаслужачых — як беларускіх, так і расійскіх, то сёлета ў вучэнні НАТА прагназуецца задзейнічаць каля 120 тысяч чалавек. Прычым пытанні, якія падчас падобных манеўраў адпрацоўвае арганізацыя, маюць ярка выражаны несяброўскі характар: разгортванне сістэмы разведкі, перакідванне войскаў да межаў Беларусі, адпрацоўка задач наступальнай тэматыкі.

Але, як заўважыў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ**, Беларусь не бачыць у гэтым пагрозы нацыянальнай бяспецы і стабільнасці да вучэнняў НАТА абсалютна адэкватна. «Працэс будаўніцтва і развіцця ўзброеных сіл любой дзяржавы не завершаны, — падкрэсліў кіраўнік «Захаду-2017» ад беларускага боку. — Апрабацыя ўсіх новых формаў і спосабаў ажыццяўляецца, вядома ж, падчас вучэнняў. У сувязі з гэтым незразумелы ажыятаж вакол «Захаду-2017». Любога роду вучэнні — аддзялення, батальёна або шматнацыянальных груповак — і прызначаны для таго, каб праверыць сумяшчальнасць сістэмы кіравання, здольнасць сумеснымі кантынгентамі войскаў выконваць пастаўленыя задачы. Таму неадэкватна рэагаваць на падрыхтоўку нашых войскаў па меншай меры не зусім карэктна».

### НА «ВЫДАТНА»

Вучэнне «Захад-2017» праходзіла ў два этапы. Практычныя дзеянні войскаў адпрацоўваліся на тэрыторыі нашай краіны: палігонах Барысаўскі, Дамanaўскі, Ружанскі, Лепельскі, Лосвіда і Асіповіцкі, а таксама на ўчастках мясцовасці Дрэтунь і Глыбокае. Акрамя таго, вучэбна-баявыя задачы выконваліся на трох палігонах Расійскай Федэрацыі. Пры вызначэнні раёнаў практычных дзеянняў для выключэння напружанасці ў адносінах з Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй прынцыпова былі выбраны палігоны, якія знаходзяцца на значнай аддаленасці ад дзяржаўнай мяжы.

На тэрыторыі Беларусі ў вучэнні было задзейнічана каля 10,2 тыс. чалавек, а таксама 370 адзінак бранятанкавай тэхнікі, да 150 адзінак артылерыі і рэактыўных сістэм залпавага агню, звыш 40 самалётаў і верталётаў, — іх колькасць не перавышае ўзровень, падлеглы абавязковаму назіранню за пэўнымі відамі ваеннай дзейнасці, устаноўлены шматлікімі дагаворамі і пагадненнямі ў галіне кантролю над узбраеннем. Дарэчы, на працягу многіх гадоў параметры задзейнічаных у краіне сіл і сродкаў застаюцца практычна нязменнымі.

У аснову розыгрышу практычных дзеянняў і эпізодаў былі пакладзены варыянты сумесных дзеянняў беларускіх і расійскіх часцей і падраздзяленняў, якія ўваходзяць у склад рэгіянальнай групоўкі войскаў, пры ўдзеле ў прыкрыцці ўчасткаў дзяржаўнай мяжы, ахове і абароне ваенных аб'ектаў, блакіраванні і ліквідацыі дыверсійна-разведвальных груп і незаконных узброеных фарміраванняў, а таксама вядзенне абарончага бою. Пры вызначэнні задумы вучэння ўлічваліся найноўшыя падыходы да прымянення войскаў (сіл) на аснове вопыту сучасных узброеных канфліктаў.

— Давераны мне асабовы склад паказаў высокую вывучку і прафесіяналізм на ўсіх этапах вучэння, — адзначыў пасля выканання вучэбна-баявых дзеянняў **камандзір асобнага парашутна-дэсантнага батальёна гвардыі падпалкоўнік Андрэй ПРОКЛІН**. — Галоўная асаблівасць вучэння ў тым, што прадстаўнікі шматлікіх сілавых структурных падраздзяленняў выконвалі задачы плячо ў плячо. Паміж намі адразу наладзілася ўзаемаразуменне. Баявая работа вялася ў радыёэфіры, у паветры і на зямлі — у комплексе гэта дазволіла паспяхова выканаць усе пастаўленыя задачы.

Задаволены вынікамі работы вайскоўцаў і **камандзір 336-й рэактыўнай артылерыйскай брыгады палкоўнік Аляксандр ЦІШКЕВІЧ**. «Разлікі ўпэўнена ўкладаліся ў часавыя нарматывы на ўсіх этапах, дзейнічалі зладжана, а дакладнасць пускаў ацэнена на «выдатна», — удакладніў ваеначальнік. — Не менш паспяховым аказалася і ўзаемадзеянне з расійскімі калегамі. Вопыт сумеснай работы назапашаны немалы, таму мы разумеем адно аднаго ўжо з паўслова».

— Ганаруся, што давялося паўдзельнічаць у такім маштабным мерапрыемстве баявой падрыхтоўкі, — прызнаўся **радавы 336-й рэактыўнай артылерыйскай брыгады Дзмітрый ЧАСЛАЎСКІ**. — Ад маіх дзеянняў залежала дакладнасць пускаў, і падвесці саслужыўцаў я проста не меў права.

А тым часам вайскоўцы, а таксама ўзбраенне, ваенная і спецыяльная тэхніка Узброеных Сіл Беларусі ўжо вяртаюцца ў пункты пастаяннай дыслакацыі. Да 30 верасня вайсковыя часці і падраздзяленні Узброеных Сіл Расіі пакінуць тэрыторыю нашай краіны.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

За вучэннем «Захад-2017» назіралі прадстаўнікі міжнародных арганізацый, ваенна-дыпламатычнага корпуса замежных дзяржаў, акрэдытаваных пры пасольствах сваіх краін у Беларусі. Як прызналіся ваенныя назіральнікі з Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны, Эстоніі, Швецыі і Нарвегіі, якія таксама прысутнічалі падчас эпізодаў вучэння, яны ніколі не бачылі столькі журналістаў на адзін квадратны метр. Вось чым яшчэ замежныя госці падзяліліся з карэспандэнтам «Звязды».



**Рагнхілд Вэле ХУСТАД (Нарвегія):**

— Сумеснае стратэгічнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі прайшло празрыста і адкрыта. Беларусь увогуле не абавязана была запрашаць на «Захад-2017» назіральнікаў, бо колькасць удзельнікаў вучэння не перавышае дазволеныя міжнародныя стандарты. Тое, што беларускі бок паказаў, як праходзіць вучэнне, сведчыць аб адкрытасці краіны перад АБСЕ і Еўропай.



**Томас МОЛЕР (Швецыя):**

— Вучэнне «Захад-2017» насіла адкрыты характар, на ўсе пытанні назіральнікі маглі атрымаць падрабязныя адказы. Я не сказаў бы, што вучэнне ўяўляла нейкую пагрозу для суседзяў Беларусі. Трэба адрозніваць вайсковыя вучэнні ад нечага іншага. Я з вялікай цікавасцю назіраў за розыгрышам баявых дзеянняў на палігоне Дамanaўскі, бо сам падчас службы быў артылерыстам.



**Каўпа КІЙС (Эстонія):**

— Беларускія вайскоўцы зрабілі вельмі вялікую работу і даказалі ўсяму свету, што ў Беларусі створана прафесійная армія. Эстонію не непакоіць дадзенае вучэнне: гэта звычайныя манеўры, і ўсе краіны маюць права іх арганізоўваць. Што датычыцца расійскага складніка вучэння, гэта вашы суседзі, і цалкам нармальна, калі вы разам вучыцеся адпрацоўваць пэўныя задачы.



■ Пакаленні

# РАМАН — АБ ВЕТЭРАНАХ

## Мінскі школьнік стварае галерэю ўспамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны

**У свае 15 гадоў Раман ЗІНЧАНКА не гуляе ў камп'ютарныя гульні і рэдка бавіць час з аднагодкамі. Тое, як ён праводзіць гэтыя летнія канікулы, здзіўляе нават дарослых. Замест таго каб катацца на веласіпедзе, плёскацца спякотай у вадзе або бавіць час, як многія сучасныя падлеткі, хлопец сустракаецца з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.**

У інтэрнэце Рома стварыў суполку «Вялікай Радзімы сыны», дзе публікуе пасты аб салдатах Перамогі. Ён фатаграфуе гэтых ужо пажылых людзей разам з іх узнагародамі, запісвае ўспаміны ўдзельнікаў тых далёкіх падзей на дыктафон і на відэа.

— Ветэраны ўжо адыходзяць з жыцця, таму вельмі важна не спазніцца, — тлумачыць мэту зусім не падлеткавага захаплення Раман. — Праз гадоў пяць-дзесяць іх ужо не будзе, але ўспаміны застануцца. Магчыма, калі-небудзь удасца ажыццявіць мару, і я збяру іх пад адной вокладкай.

Цікавіцца тэмай Вялікай Айчыннай вайны хлопец пачаў не так даўно. Задумацца прымусілі ўзнагароды і фотаздымкі родных, знойдзеныя ў сямейным архіве. Сваіх продкаў-франтавікоў, а таксама ўдзельнікаў падпольнага руху, ён, відома, у жывых не застаў, затое дасканала вывучыў іх біяграфіі з дапамогай мамы і бабулі.

Раман паказвае пажаўцелыя ад часу фотаздымкі і пачынае свой расказ: «Мая прабабуля, Марыя Фёдараўна Чупрыс, яшчэ да вайны працавала ў бальніцы. Асісціравала Герою Савецкага Саюза Яўгену Клумаву. У гады акупацыі жыла ў Мінску. Насіла лістоўкі, збірала нейкія звесткі — адным словам, як усе».

Сапраўды, жыхары акупаванай сталіцы Беларусі шмат у чым дапамагалі фронту, але далёка не ва ўсіх на грудзях зіхацеў ордэн Айчыннай вайны II ступені. Не кожны з мірных жыхароў меў пасля вайны і пасведчанне партызана Беларусі. Але не пра гэта...

Старэйшы брат прабабулі Рамана Дзмітрый Чупрыс быў кадравым ваенным. Скончыў школу чырвоных камандзіраў. Удзельнічаў у савецка-фінскай вайне, з першых дзён Другой сусветнай — на фронце. Дэсантам быў перакінуты на акупаваную тэрыторыю Беларусі. Па словах праўнука, у якасці начальніка штаба разведвальна-дыверсійнага атрада «Дзімы» ўдзельнічаў у падрыхтоўцы аперацыі па знішчэнні палача беларускага народа гаўляйтара Кубэ. Потым быў пераведзены ў партызанскую брыгаду «Штурмавая», з дзейнічаючай арміяй дайшоў да Германіі. Быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў.

Былі ў сям'і Рамана і іншыя, не менш гераічныя продкі. Тэма Вялікай Айчыннай вайны тут ніколі забытай не была. Невыпадкова ідэю хлопца — сабраць успаміны франтавікоў — падтрымалі ўсе. А пачалося ўсё з таго, як разам з некалькімі аднакласнікамі яго адправілі павіншаваць аднаго ветэрана са святам Перамогі. Школьніку было вельмі цікава ўбачыць удзельніка тых падзей, яшчэ цікавей — пачуць пра баявыя справы. Тады і ўзнікла жаданне пазнаёміцца з франтавікамі бліжэй. Знайшоў праз інтэрнэт адрас аднаго з іх, патэлефанаваў, дамовіўся аб сустрэчы. Той пагадзіўся.

— Але не ўсе ўдзельнікі вайны такія даверлівыя, — прызнаецца Раман Зінчанка. — Яно зразумела: не раз іх падманвалі, нават абкрадалі. Ды і дзіва якое — сучаснаму хлопчыку цікава даведацца пра вайну! Цяпер дзейнічаю афіцыйна: праз саветы ветэранаў. Там мне даюць кантакты, тады смела тэлефаную, спасылаючыся на старшыню або яго намесніка. Калі ветэраны чуюць знаёмыя прозвішчы, пагаджаюцца сустракацца больш ахвотна.

Аднойчы адну з дачок ветэрана адолела сумненне, і тая вырашыла праверыць, ці сапраўды ёсць такі школьнік. Аказваецца, бацьку жанчыны неяк падманулі, таму яна вырашыла быць больш пільнай. Вось і патэлефанавала ў 71-ю мінскую школу, дзе вучыцца Раман. Так настаўнікі і аднакласнікі даведаліся пра незвычайнае захапленне падлетка.

— Размаўляючы з ветэранам, мне цікава даведацца не толькі пра яго баявы шлях, а і пачуць пра яго дзяцінства, пра тое, як наладжвалася пасляваеннае жыццё, — расказвае Раман. — Ветэранаў, якія прайшлі ўсю вайну, засталося вельмі мала. У асноўным сустракаюся з тымі, хто трапіў пад апошні прызыў. Але шчасціць і на такія баявыя эпізоды, што хоць ты фільм здымай! Аляксандр Іванавіч Слабада расказвае пра бітву на Буйніцкім полі і абарону Масквы, Аляксандр Фёдаравіч Фень успамінае падзеі пад Сталінградам і Курскам, тое, як вызвалялі Мінск...



100-гадовага ваеннага ўрача Фёдара Іосіфавіча ПАЛІЎНІКАВА Раман марыць пазнаёміць са сваімі аднакласнікамі.



З танкістам Аляксандрам Фёдаравічам ФЕНЕМ школьнік можа правесці ледзь не ўвесь дзень: у франтавіка багата гісторый.

Не сакрэт, што не ўсе ветэраны могуць пахваліцца вострасюжэтным эпізодам са свайго жыцця. Іх, відома, было нямала, але памяць падводзіць. Затое яны з задавальненнем гутараць з Раманам пра надзённае. «Многім з іх часам проста трэба выказацца, — перакананы дзесяцікласнік. — У большасці сваёй ветэраны — адзінокія людзі, якія нават пры наяўнасці сваякоў часам не маюць з кім пагаварыць. Іх блізкія настолькі занятыя ўласнымі справамі, што часам не заўважаюць, што жывуць побач з баявым чалавекам».

— Па досведзе ведаю, што часам у ветэрана можна правесці ледзь не цэлы дзень. Не напружвае? — цікаўлюся.

— Можа, іх і напружвае, мяне не, — прызнаецца Рома. — Калі адчуваю, што суразмоўнік стаміўся, закругляюся. У таго ж танкіста Аляксандра Феня быў неяк з 11 раніцы і да дзевяці вечара. Нам было цікава разам.

— Але пра вайну сёння можна даведацца з розных крыніц. У тым жа інтэрнэце, у кіно...

— А адкуль ведама, што там праўда? — не пагаджаецца хлопец. — Хочацца пачуць жывыя расказы тых, хто на свае вочы бачыў ворага, змагаўся з ім. Часам здзіўляешся, што ты сядзіш насупраць чалавека, які ўдзельнічаў у легендарных падзеях, бачыў многае, узнагароджаны такімі высокімі ордэнамі і медалямі!

Са сваімі ветэранамі Раман падтрымлівае сувязь і пасля таго, як выканаў сваю асноўную місію — запісаў успаміны. Віншуе іх са святамі, тэлефануе і без нагоды: спытаць, напрыклад, як здароўе, справы. Некаторых удзельнікаў наведвае рэгулярна.

— Я выдатна разумею: хтосьці хоча мець зносіны, іншым гэта не патрэбна, — кажа школьнік. — Са 100-гадовым ваенным урачом Фёдарам Іосіфавічам Паліўнікавым мы нават пасябравалі. Большасць сваякоў ветэрана жыве ў Хабараўску, таму ён вельмі рады, калі я да яго прыходжу. І мне прыемны яго клопат. Тэлефанаваў нядаўна, пытаўся, як я падрыхтаваўся да школы. Вельмі хачу пазнаёміць яго са сваімі аднакласнікамі. Калі ўсё атрымаецца, Фёдар Іосіфавіч выступіць перад імі.

Да ветэранаў Вялікай Айчыннай Рома ходзіць адзін. Кажа, што таварышам гэта нецікава. Хутка ён абыдзе сваіх ветэранаў па другім разе. Кагосьці наведае і пяты раз. Місія такая — стварыць галерэю партрэтаў удзельнікаў вайны з іх узнагародамі. Праўда, у школе пачаліся заняткі, таму вольнага часу ў Рамана стала значна менш. Але хлопец не сумуе. «Ёсць жа і другая палова дня, і выхадныя, — гаворыць ён. — Галоўнае, каб яны ведалі, што я пра іх помню. Толькі і думаю аб ветэранах».

**Вераніка КАНЮТА.**

*kanyuta@zviazda.by*

**Фота з архіва Рамана ЗІНЧАНКІ**

■ Векапомнае

# КАМАНДЗІР І ЯГО ЗОРЫНЦЫ

## Баявыя справы атрада, створанага Шоламам ЗОРЫНЫМ, залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны



Шолам ЗОРЫН (у ніжнім радзе ў цэнтры).

**Першым найцяжэйшым выпрабаваннем у гады ваеннага ліхалецця для Шолама Натанавіча стала пападанне ў 1941 годзе ў Мінскае гета. Але яму ўдалося апынуцца на волі. Уцёкі былі зроблены з мэтай арганізацыі партызанскага атрада. І такі атрад з'явіўся. Фарміраваннем дадзенай баявой адзінкі, якая насіла імя героя грамадзянскай вайны Пархоменкі, займаліся ў роўнай ступені і Зорын, і Сямён Ганзенка, які ўцёк з мінскага лагера для ваеннапалонных. Ён і стаў камандзірам атрада, які дыслакаваўся на Міншчыне.**

Першапачаткова ў атрад уваходзіла каля 150 партызан. У большасці з іх быў такі ж лёс, як і ў Зорына: яны збеглі з таго ж гета. І дапамагаў ім у гэтым Шолам Натанавіч. Толькі істотнае павелічэнне долі яўрэяў у партызанскім атрадзе імя Пархоменкі падабалася далёка не ўсім байцам. І яўрэі гэта адчувалі. Тады Ганзенка прапанаваў Зорыну стварыць самастойную баявую адзінку выключна з яўрэяў.

5 чэрвеня 1943 года для Шолама Натанавіча прабіў зорны час. Ён сам рыхтуе і падпісвае загад аб стварэнні яўрэйскага сямейнага партызанскага атрада. Першапачаткова зорынцы дыслакаваліся на мяжы Баранавіцкай і Мінскай абласцей. 11 месяцаў атрад не меў афіцыйна ўсталяванай назвы. Потым гаворка пайшла пра 106-ы атрад. У выніку папоўнілася чарговым фарміраваннем Івянецкае партызанскае злучэнне, стала больш народных мсціўцаў у Налібоцкай пушчы.

У камандзіра атрада пастаянна адчувалася моцная ваенная жылка. Бліскуча спрацавала яго гаспадарская хватка. У лічаныя тыдні стаў рэальнасцю лясны лагер з узрушальнай канцэнтрацыяй поліфункцыянальнай інфраструктуры. З'явіліся зямлянкі, у якіх не было холадна. Атрымалі свой уласны кут зброевых спраў майстры. Было аператыўна закрыта пытанне па кадрах і тэхнічных сродках для пашыву і рамонту адзення. Шырокі фронт работы быў у шаўцоў, для якіх адкрылася спецыяльная майстэрня. Аператыўна змантавалі абсталяванне для выпякання хлеба, у асобным цэху начынялі каўбасы. Запрацавала друкарня.

Атрад Зорына адзначаўся і падборам першакласных эскулапаў. Сфарміравалася каманда з дзевяці самаадданых людзей, якія дзень і ноч дэманстравалі вернасць клятве Гіпакрата. Дарэчы, сярод пацыентаў лекараў-зорынцаў было мноства людзей, якія не мелі ніякага дачынення да 106-га атрада.

На месцы дыслакацыі знайшлі сябе і тыя, хто сеяў разумнае, добрае, вечнае. Без малога 70 дзетак набывалі веды, адчувалі сябе адзінай школьнай сям'ёй. Наогул, дзеці — а такіх у атрадзе было без малога 150 — з'яўляліся для Зорына прыярытэтам нумар адзін. У большасці з іх абодва бацькі былі знішчаны акупантамі і іх памагатымі. Гэтыя сіроты адчувалі з боку Зорына сапраўды бацькаў клопат.

Праз паўгода ў атрадзе налічвалася больш як 500 чалавек, а праз год — звыш 800. Касцяк зорынцаў складалі ўцекачы з Мінскага гета. Імі здабывалася і перадавалася ў цэнтр стратэгічна важная інфармацыя, знішчалася мноства значных для ворага камунікацый, былі пазбаўлены жыцця сотні акупантаў і іх памагатых. Былы баец атрада Ісак Грынберг успамінаў: «Зорын заўсёды сам вёў сваіх партызан на ўсе небяспечныя справы, яго прыклад натхняў і падтрымліваў нас у цяжкія хвіліны». У чэрвені 1944 года Шолам Натанавіч у баі страціў нагу...

Гісторыя 106-га атрада скончылася 9 ліпеня 1944 года. Большая частка яго байцоў улілася ў рады Чырвонай Арміі. Уклад Шолама Натанавіча ў Вялікую Перамогу адзначаны шэрагам узнагарод: ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі «Партызану Айчыннай вайны», «За перамогу над Германіяй».

Праз 43 гады пасля смерці Шолама Зорына ўяўляецца неабходным паставіць пытанне пра ўвекавечанне памяці пра яго на беларускай зямлі. Напрыклад, прысвоіць яго імя адной з вуліц Мінска.

**Міхаіл СТРАЛЕЦ, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта**

■ Прырода і чалавек

# ЖЫВЕ КУЛІК, ДЗЕ ПРЫВЫК, І КОЖНЫ РОДНАЕ БАЛОТА ХВАЛІЦЬ,

## або Чаму гагара чыкільгае нібы дзіця, якое вучыцца хадзіць

**Рык волата-зубра, пошчак вавёркі, шчэбет лясных птушак. Не ў кожнага ёсць магчымасць пачуць іх у жывой прыродзе. А вось у Валожынскім раённым краязнаўчым музеі можна не толькі пабачыць на дыяпраектары розных птушак і звяроў, але і атрымаць асалоду ад гукаў лясных насельнікаў.**


Вучні з Рэчыцы на экскурсіі.

Будынак, дзе цяпер месціцца музей, узвялі ў 1920 годзе для гарадскога бургамістра і яго сям'і. У свой час тут быў дзіцячы садок. Для малых пабудавалі новую дашкольную ўстанову адукацыі, а вызваленыя плошчы перадалі пад музей. Ён самы малады ў Мінскай вобласці, адкрыўся для наведвальнікаў у 2010 годзе.

— Яго асноўная місія — збіраць, захоўваць і папулярызаваць прадметы, якія раскрываюць гісторыю Валожынскага краю, — кажа **дырэктар музея Наталля ЛОЎЧАЯ**.

Частка Валожынскага раёна размешчана на тэрыторыі Налібоцкай пушчы — аднаго з самых старажытных беларускіх лясоў, які захаваў свае межы яшчэ з Сярэднявечча. Тут водзіцца 295 відаў розных жывёл, у тым ліку еўрапейскія зубры, алені, ласі, казулі, дзікі, ваўкі, лісы, 29 відаў птушак. Некаторыя з іх занесены ў Чырвоную кнігу. Адну з залаў адвялі пад пастаянную экспазіцыю «Прырода і экалогія», дзе сабраны чучалы некалькіх дзясяткаў прадстаўнікоў налібоцкай фаўны. Для музея, які не надта сталы, гэтая калекцыя даволі значная. І яна рэгулярна папаўняецца. Асабліва ў захапленні ад знаёмства з жыццём, звычкамі птушак і звяроў дзеці. Вось і гэтым разам у музей завіталі вучні з Рэчыцкай сярэдняй школы №6, што на Гомельшчыне. Яны адпачываюць і праходзяць аздараўленне ў дзіцячым санаторыі «Налібоцкая пушча». Кіраўніцтва здраўніцы арганізавала для іх экскурсію ў музей. Да гаманлівай чародкі прыстройваюся і я.

— Вы задумваліся, чаму сароку называюць белабокай, трашчоткай? — звяртаецца да наведвальнікаў навуковы супрацоўнік музея Ніна Бобрык.

У адказ — цішыня і цікаўныя позіркі. Відаць, надта ж хочацца малым даведацца пра гэты сакрэт.

— Напэўна, здаралася, што дзяўчынак настаўніца называла сарокамі-балаболкамі. Бо яны сваімі размовамі перашкаджалі весці ўрок, — падказвае Ніна Уладзіміраўна. — А яшчэ сароку клічуць чысцёхай, зладзейкай.

— Я ведаю чаму: яна любіць рэчы, якія блішчаць, можа нават тэлевізар украсці, — выказвае здагадку адзін з хлопчыкаў.

— Ну, сцягнуць тэлевізар ёй не пад сілу. А вось ювелірныя вырабы, бліскучыя дробныя рэчы нельга пакідаць навідавоку пры адкрытым акне. Сарока, калі выпадкова заляціць у дом, панясе іх у сваё гняздо. Наогул, гэта вельмі разумная птушка. Яе вельмі лёгка навучыць размаўляць, хутчэй, чым папугая. Сарока не пацерпіць каля сябе канкурэнтаў, абавязкова выганіць з дому іншую птушку, якую прытулілі гаспадары. А чысцёха яна таму, што любіць, каб у гняздзе быў парадак, знаходзіць спадручныя прадметы і пастаянна чысціць сваё жыллё, — тлумачыць Ніна Бобрык.

Чорная варона і крумкач таксама хутка вучацца гаварыць, умеюць рашаць лагічныя задачы на ўзроўні пяцігадовага дзіцяці. Калі стварыць нестандартную сітуацыю, яны заўсёды знойдуць выхад. Самы рацыянальны і самы правільны. Вароны маюць унікальную памяць і здольнасць запамінаць свайго крыўдзіцеля. «Ні ў якім разе не разбурайце яе гняздо, не запускайце ў яе каменьчыкам. Варона можа адпомсціць вам нават калі станеце дарослымі. Інфармацыя захоўваецца ў памяці птушак надоўга і нават перадаецца па спадчыне дзецям, унукам», — папярэджвае экскурсавод.

— Я выпадкова ўдарыў птушку, ды потым пашкадаваў яе, пачаў падкормліваць і праз чатыры дні яна паляцела, — прызнаўся школьнік гадоў сямі. — Але больш ніколі так не буду рабіць.

Наступнае знаёмства з лебедзямі. У свеце ўсяго шэсць відаў гэтых грацыёзных птахаў. З гэтай птушкай звязана шмат легендаў, у тым ліку пра іх вернасць. Кажуць, калі гіне адзін, то іншы падымаецца высока ўверх і склаўшы крылы падае на зямлю, нібы камень. Гэта толькі легенда. На самай справе лебедзі пасля гібелі партнёра ствараюць новыя сем'і. Але ў парах яны не пакідаюць адно аднаго, заўсёды разам. Аляксандр Грын назваў лебедзяў арыстакратамі вадаў, а Мікалай Забалоцкі — беласнежным цудам, Чайкоўскі стварыў чароўную музыку да балета «Лебядзінае возера». Ханс Крысціян Андэрсен напісаў казку пра гэтых птушак «Брыдкае качаня».

— А чулі такую прымаўку: жыве кулік, дзе прывык і кожны роднае балота хваліць? — цікавіцца ў малых Ніна Бобрык. — Налібоцкая пушча — забалочаны край, і тут водзіцца шмат відаў кулікоў. Ва ўсіх тонкія ногі і доўгая вострая дзюба, каб здабываць у балоце корм...

Здавалася, дзеці гатовы слухаць цікавыя аповеды бясконца, ды час развітвацца.

— Мне ўсё вельмі спадабалася, — прызнаўся Рома Сіманаў. А яшчэ я зразумеў, што нельга крыўдзіць братоў нашых меншых, яны — частка нашага свету і жыцця.

— Я ўпершыню даведалася, якіх памераў бываюць звяры і птушкі. Здзівіла, што філін можа важыць да 25 кілаграмаў, а дзятлы — вельмі моцныя птушкі, — падзялілася ўражаннямі Даша Пешкун.

На развітанне школьнікі набылі магніцікі з выявай Валожына і паабяцалі пры першай магчымасці яшчэ раз сюды вярнуцца з бацькамі, сябрамі, брацікамі і сястрычкамі.

— Дзецям мы расказваем пра прыроду Налібоцкага краю, яго насельнікаў у гульнявой форме. Для кожнага ўзросту распрацаваны свае ўрокі. Імкнёмся, каб малым было цікава, — расказала Наталля Лоўчая. — Да нас прыводзяць дзяцей з садкоў, мы ім уключаем фанаграму з галасамі насельнікаў пушчы, расказваем пра жыццё розных відаў фаўны. У спецыяльна афармленым куточку лесу два ваўкі нападаюць на казулю. Гэтая карцінка знаёміць дзяцей з тым, што адбываецца ў дзікай прыродзе, як ідзе барацьба за выжыванне. Трэба каб яны ведалі, шанавалі прыроду, бо без прыроды мы ніхто.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Актыўная пазіцыя

# СЯМ'Я, КРАІНА, МОЛАДЗЬ

## Вызначаны пераможцы конкурсу «Залатое пяро «Белай Русі» — 2017»

**Днямі грамадская арганізацыя «Белая Русь» узнагародзіла пераможцаў і прызёраў уласнага конкурсу «Залатое пяро». За пяць гадоў існавання ў конкурсе прынялі ўдзел больш за 7 тысяч маладых людзей, а ў 2017-м свае работы даслалі больш за 1500 чалавек.**

— Конкурс праходзіў у тры этапы — раённы, абласны і рэспубліканскі. Ужо на апошнім туры засталося 96 твораў, з якіх мы выбіралі пераможцаў, — расказаў **намеснік старшыні рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр ШАЦЬКО.** — Нашай асноўнай мэтай было прыцягненне юных журналістаў да актыўнай сацыяльна-палітычнай дзейнасці. Работы вельмі цікавыя, і іх аўтараў заўважаюць галоўныя рэдактары газет, бяруць працаваць у якасці карэспандэнтаў.

У намінацыі «Беларусь вачамі дзяцей» — гэта конкурс друкаваных матэрыялаў аб культурна-гістарычнай і духоўнай спадчыне Беларусі для ўдзельнікаў ва ўзросце ад 12 да 17 гадоў — 1-е месца заняў Ілья Руткевіч. У намінацыі «Сямейны альбом» — конкурсе мастацкай фатаграфіі, якая адлюстроўвае каштоўнасць сямейных традыцый і сувязі пакаленняў — найлепшым стаў Аляксей Капшуль. У намінацыі «Твой погляд» — конкурсе відэапраектаў, якія асвятляюць праблемы падрастаючага пакалення беларусаў, — перамагла Таццяна Ятчык. У намінацыі «Журналістыка XXI стагоддзя» — конкурсе даследчых эсэ, якія змяшчаюць у сабе індывідуальныя ўражанні і меркаванні аўтара на тэму праблем і тэндэнцый развіцця сучасных СМІ, — 1-е месца дасталася Марыі Фядзюшкінай.

«Я, як настаўнік-філолаг, у першую чаргу павінна паказваць добры прыклад для сваіх вучняў. Тады дзеці, ідучы ўслед за сваім настаўнікам, будуць бачыць, што можна і трэба скараць новыя вяршыні, імкнуцца да ўдасканалення, — лічыць трэцяя пераможца ў намінацыі «Журналістыка XXI стагоддзя», **выкладчык беларускай мовы і літаратуры сталічнай сярэдняй школы №21 Галіна СТРАЛЬЧУК.** — Мая работа — гэта яшчэ адна ступень у асабістым жыцці і, вядома, прафесійным. У першую чаргу трэба прысвяціць сям'і, а таксама другой сям'і — школе і вучням».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА РУП «БЕЛОРУСНЕФТЬ – БРЕСТОБЛНЕФТЕПРОДУКТ»**

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ №3:** Автомобиль МАЗ 5551-020 грузовой самосвал, регистрационный знак АВ 7495-1 | 2 220,99 | 312,00 |
| **ЛОТ №10:** Автомобиль ГАЗ 3302-414, регистрационный знак АА 4508-1 | 1 355,86 | 312,00 |
| **ЛОТ №11:** Автомобиль ГАЗ-33023-406, регистрационный знак 4905 ВТ-1 | 1 810,18 | 312,00 |
| **ЛОТ №12:** Автомобиль ГАЗ-33023-408, регистрационный знак АВ 4066-1 | 1 810,18 | 312,00 |
| **ЛОТ №13:** Автомобиль ГАЗ-33023-414, регистрационный знак АВ 1106-1 | 1 726,21 | 312,00 |
| **ЛОТ №14:** Автомобиль ГАЗ-33023-16, регистрационный знак 0409 АО | 1 093,69 | 312,00 |
| **ЛОТ №17:** Прицеп ПЦ 6.7 8925 шасси 861891, регистрационный знак 6966 АА-1 | 2 362,89 | 312,00 |
| **ЛОТ №18:** Прицеп ПЦ-6.7-8925, регистрационный знак 1753 АА-1 | 946,93 | 312,00 |
| **ЛОТ №19:** Полуприцеп-цистерна ППЦ-22, регистрационный знак А 3887 А-1 | 6 370,87 | 312,00 |
| **ЛОТ №20:** Полуприцеп-цистерна ППЦ-22, регистрационный знак А 3207 А-1 | 5 210,87 | 312,00 |
| **ЛОТ №21:** Полуприцеп-цистерна ППЦ-24, регистрационный знак А 8865 А-1 | 27 072,67 | 312,00 |
| **ЛОТ №22:** Прицеп бортовой тентовый, регистрационный знак А 0484 В-1 | 804,69 | 312,00 |
| **ЛОТ №24:** Автомобиль пожарный, регистрационный знак AI 0096 | 1 046,99 | 312,00 |
| **Условия продажи** | без условий | |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | |
| **Условия оплаты** | в соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | |

**Аукцион состоится 5 октября 2017 г. по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**ЛОТЫ №№3–14 – в 11.00; ЛОТЫ №№17–24 – в 12.00**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 4 октября 2017 г. до 17.00**



**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**ВЕРХНЕДВИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка, который состоится 26 октября 2017 г. в 15.00 в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний, 2-й этаж).**

**На аукцион будут выставлены:**

лот №1 – земельный участок с кадастровым номером 221050100001001261, расположенный по адресу: Витебская область, город Верхнедвинск, улица Советская, площадью 0,0131 га, для содержания и обслуживания торгового павильона, срок аренды – до 17 сентября 2020 года, начальная цена предмета аукциона – 200,50 рубля, размер задатка – 20,05 рубля;

лот №2 – земельный участок с кадастровым номером 221050100001001908, расположенный по адресу: Витебская область, город Верхнедвинск, улица Советская, в районе колхозного рынка, площадью 0,0083 га, под установку торгового павильона, срок аренды – до 17 сентября 2020 года, начальная цена предмета аукциона – 127,04 рубля, размер задатка – 12,70 рубля.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) с 25 сентября по 23 октября 2017 г. (включительно) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 64. Заключительная регистрация участников 26 октября 2017 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Контактный телефон в г. Верхнедвинске 8 (02151) 62897.

Подробная информация о проведении аукциона, условиях продажи размещена на сайте Верхнедвинского райисполкома: verkhnedvinsk.vitebsk-region.gov.by

УНП 300063038



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже здания подстанции, Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, ул. Карла Маркса**

Лот №1. Подстанция с инв. №623/С-29510. Назначение: здание специализированное энергетики. Г. п. – инф. нет; этаж – 2; общая площадь – 49,1 кв. м. **Начальная цена продажи – 10 789,20 бел. руб. Задаток – 1 070,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5%**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 625650100002000156, расположенный по адресу: Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, ул. Карла Маркса, пл. 0,3676 га. Назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Право аренды по 30.09.2059

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 13.10.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Подстанция) (Лот №1), проводимом 13.10.2017 (Слуцкий МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 11.10.2017 в 11.00.
Все желающие могут ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Антипов Сергей Алексеевич +375-(25)-510-89-20

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

# «ТРЭБА САМОМУ СЯБЕ ПАДШТУРХОЎВАЦЬ, А ЯК ІНАКШ?»

## Станеце патрэбнымі — жыццёвых варыянтаў адразу дадасца

**Ведаеце, колькі прыступак ад дзвярэй у пад'ездзе да ліфта ў тыпавым шматпавярховым доме? Сем. Сярэдні чалавек праходзіць іх часцей за ўсё на аўтамаце, увесь у сваіх думках або ў размове, калі не адзін... Зрэшты, Аляксей СУШАНЦОЎ са Светлагорска, які перамяшчаецца на інваліднай калясцы, кажа пра гэтыя прыступкі нават з нейкім гумарам. Мяркуючы па ўсім, ён не з тых, хто скардзіцца.**

**Лёс распарадзіўся ім па-свойму. Што мог супрацьпаставіць яму Аляксей? Толькі сваю захопленасць, упартасць і працавітасць, нават у нейкай ступені — азарт. Цяпер ён займаецца любімай справай, мае стасункі з шырокім колам творчых людзей, сам выступае на сцэне. У яго ёсць, як сам Аляксей з гумарам кажа, жонка, дзіця, сабака, кот і машына, што дазваляе не проста рухацца па горадзе, а і падарожнічаць. І ўсяго гэтага, і перш за ўсё магчымасці весці насычанае і зусім не шэрае жыццё, ён дасягнуў сам.**



### Пасля трагедыі авіяцыя адпала. А музыка — не

Яшчэ 10 гадоў таму, не чакаючы, пакуль яму нехта дапаможа з пандусам і з усім астатнім, Аляксей прадаў сваю кватэру на трэцім паверсе ў Светлагорску і купіў на першым, каб мінімізаваць колькасць перашкод на сваім шляху. Таму што ў большасці нашых дамоў, нават калі ёсць ліфт, да яго ўсё адно вядуць прыступкі. У кватэры, дзе ён жыве цяпер, — асобны ўваход з тарца, да якога прыбудаваны пандус. З ім Аляксею часткова дапамог райвыканкам, а частку грошай за яго ўстаноўку ён аплаціў сам. Не праяві наш герой уласнай актыўнасці, чакаць пандуса прыйшлося б намнога даўжэй.

...Я звяртаю ўвагу на гукаізаляцыю ў пакоі, мяркуючы па ўсім, працоўным кабінеце Аляксея.

— Напэўна, суседзі шумныя? — кажу не падумаўшы.

— Наадварот, гэта я шумны, — усміхаецца ён. — У мяне проста тут гуказапісная студыя.

Музыка — даўняе захапленне нашага героя, якое ў рэшце рэшт стала работай. Ён стварае аранжыроўкі, запісвае музыкантаў — «такая вось музычна-мантажная праца», зноў усміхаецца Аляксей... У гэтую суботу ў Светлагорску дзень горада, і сёння ён сядзіць і працуе над фанаграмай — робіць да свята песню.

**Сам прызнаецца, што, калі асвойваў гэтае майстэрства, аж рукі трэсліся: хутчэй бы паспрабаваць пачаць рабіць нешта сапраўднае!**

Аляксею Сушанцову 41 год. Палову свайго жыцця ён правёў у інваліднай калясцы. Кажа, што, калі яму было 20, захапляўся дэльтапланерызмам. І вось няшчасны выпадак... Ён тады вучыўся ў Самары на авіяканструктара. Пра безбар'ернае асяроддзе ў той час яшчэ і не чулі, таму прыйшлося кінуць вучобу і вярнуцца ў Беларусь, да бацькоў.

— У мяне было два моцныя захапленні: авіяцыя і музыка, — расказвае наш герой. — Пасля трагедыі авіяцыя адпала. А музыка — не.

Калі ў наша жыццё ўвайшлі камп'ютары, з'явілася магчымасць вучыцца і асвойваць многія рэчы самастойна. У Аляксея супалі прыродныя музычныя даныя, інжынернае мысленне (усё ж такі тры гады ён правучыўся на авіяканструктара), зацятасць і цярпенне — з усім гэтым ён і пачаў асвойваць музычны мантаж. Потым пайшлі аранжыроўкі песень, фанаграмы... І ў выніку яго ў 2002 годзе запрасілі працаваць гукаінжынерам. А запісаную Аляксеем Сушанцовым у 2009 годзе песню нават разглядалі ў сталіцы ў якасці прэтэндэнткі на «Еўрабачанне».

Людзі хочуць самавыяўлення, тых, хто марыць альбо проста любіць спяваць, шмат. А значыць, Аляксею няма чаго баяцца застацца без работы, хоць і не сказаць, што яна прыносіць нашаму герою нейкія велізарныя грошы. Самае галоўнае — што гэта любімая справа. Вось нядаўна адзін яго знаёмы вырашыў запусціць сваё радыё. Вядома, звярнуўся да Аляксея: той рабіў для яго музычныя застаўкі ў эфір. Запісвае ён фанаграмы і для музычных школ, і для рэпераў-пачаткоўцаў... Калі б не падабалася — не навучыўся б так якасна працаваць. Сам прызнаецца, што, калі асвойваў гэтае майстэрства, аж рукі трэсліся: хутчэй бы паспрабаваць пачаць рабіць нешта сапраўднае!

Але і фізіку, без якой немагчыма ўявіць сабе авіяцыю, Аляксей таксама не забывае. Ужо некалькі гадоў як аформіўся індывідуальным прадпрымальнікам і падзарабляе рэпетытарам па гэтым прадмеце...

### «Ніхто не возьме на работу з жалю...»

А яшчэ Аляксей, акрамя ўсяго іншага, у пачатку 2000-х завочна скончыў юрфак БДУ. Гэтую адукацыю ён цяпер не выкарыстоўвае. Але лічыць, што яна дадала жыццёвых варыянтаў: цяпер ён спецыяліст у трох абласцях, ды і прававое мысленне ніколі не бывае лішняе. Лепш быць шматвектарным, заўсёды добра, калі ў чалавека ёсць варыянты, мяркуе ён.

Калі мы пачынаем разважаць аб тым, што трэба зрабіць, каб людзі з інваліднасцю — асабліва гэта датычыцца інвалідаў-калясачнікаў, — не замыкаліся ў сценах сваёй кватэры, Аляксей кажа: «Лічу — трэба вучыцца. Адукацыя для такіх хлопцаў і дзяўчат патрэбная як ні для каго іншага».

Вядома, у нас яшчэ ёсць складанасці з даступнасцю асяроддзя. Бо нават завочная адукацыя прадугледжвае вочныя сесіі два разы на год. І трэба неяк даехаць да ўніверсітэта, дзесьці пасяліцца — і там не павінна быць бар'ераў. А калі нехта мэтанакіравана вывучыўся і хоча працаўладкавацца, то яму трэба неяк дабірацца на работу, каб на працоўным месцы таксама было безбар'ернае асяроддзе.

«Таму, у цэлым, маё меркаванне такое: тут важным з'яўляецца рух і знізу, і зверху», — робіць выснову Аляксей.

Сам ён сваё працоўнае месца, як мы ўжо ведаем, абсталяваў у сябе дома — яго прафесія гэта дазваляе. Запісаныя фанаграмы потым адсылае работадаўцу або заказчыку праз інтэрнэт.

Вядома, стварэнне безбар'ернага асяроддзя, вылучэнне працоўных месцаў для людзей з інваліднасцю — гэта абавязак дзяржавы. Але Аляксей на сваім прыкладзе паказвае важнасць намаганняў і з боку самога чалавека. Людзям у інваліднай калясцы трэба старацца думаць самім, як стаць патрэбнымі. І тут важна не толькі атрымаць адукацыю, але і стаць найлепшым у сваёй прафесіі.

Ніхто нікога зараз не возьме на працу з жалю або па абавязку толькі таму, што ты інвалід. Чалавек павінен добра ўмець нешта рабіць, інакш нічога не дапаможа. Цяпер дзякуючы камп'ютарам і інтэрнэту працоўнае месца можна стварыць дома. Але як стаць добрым спецыялістам?

— Самому сябе падштурхоўваць, а як інакш? — упэўнены Аляксей. — Калі б я сам не асвоіў прафесію гукарэжысёра, не навучыўся нармальна рабіць гэтую работу ці рабіў бы яе горш, чым хто-небудзь другі, на працу ўзялі б гэтага другога, а не мяне. Станьце патрэбнымі — і вас возьмуць, і работадаўца захоча і знойдзе магчымасці, нават пры адсутнасці даступнага асяроддзя. Гэта ўвогуле датычыцца ўсіх — і людзей з інваліднасцю, і здаровых. Нам усім трэба быць вельмі патрабавальнымі да сябе. Хоць, хачу сказаць, людзі ў калясках, як правіла, вельмі стараюцца, таму што на пенсію пражыць вельмі цяжка. Так, зараз крызіс. І нам усім трэба прыкладаць шмат намаганняў, але рэаліі такія, што людзям з інваліднасцю іх трэба прыкладаць яшчэ больш.

І калі няма даступнага асяроддзя, трэба самім адстойваць свае інтарэсы і патрабаваць яго стварэння. Людзі ў нас выдатныя, неабыякавыя. Заўсёды дапамогуць, варта толькі звярнуцца. З гэтым праблем няма. Але за стварэнне безбар'ернага асяроддзя адказвае ўлада, а не простыя людзі. Гэта яе клопат. І нам трэба патрабаваць, каб усё гэта выконвалася.

### «Ура, мы ў Еўропе!» — а праз тыдзень, едучы ў Беларусь: «Ура, мы дома!»

Аляксей, як мы ўжо зразумелі, чалавек шматвектарны і не замыкаецца на чымсьці адным. Апроч работы з гукам ён вырашыў і сам выступаць на сцэне. Два гады быў вакалістам у мясцовым рок-гурце. А ў мінулым верасні ў яго і яго таварыша, гітарыста, з'явілася ідэя новага музычнага праекта. І вось ужо год яны іграюць па вечарах у мясцовай піцэрыі «Smile» французскі шансон. Дакладней, гітарыст іграе, Аляксей спявае. «Мы рабілі і джазавую праграму, а цяпер працуем над трэцяй праграмай: будзем выконваць песні з савецкіх кінафільмаў», — расказвае ён.

**«Станьце патрэбнымі — і вас возьмуць, і работадаўца захоча і знойдзе магчымасці, нават пры адсутнасці даступнага асяроддзя. Гэта ўвогуле датычыцца ўсіх — і людзей з інваліднасцю, і здаровых».**

Часам для разнастайнасці хлопцы ездзяць у Гомель, там іграюць у парку. А гэтым летам Аляксей са сваім таварышам вырашылі паспрабаваць сябе ў якасці вулічных музыкаў у Берліне. Атрымалі візу, селі на машыну і паехалі. Гэта было самае сапраўднае музычнае падарожжа.

— Спачатку быў Вільнюс, — з лёгкай настальгічнай усмешкай успамінае Аляксей. — Спыніліся там, igralі на праспекце Гедыміна. Потым адправіліся ў Польшчу. Зрабілі прыпынак у Гданьску, выступілі ў гістарычным цэнтры. Там было шмат і іншых вулічных музыкаў, ну, і мы далучыліся таксама. Зарабілі сабе на бензін і ўначы паехалі далей.

У Берліне велізарнае мноства вулічных музыкаў, але ніякіх канфліктаў паміж імі няма. Усе дамаўляюцца: зараз я іграю паўгадзіны, потым ты. Узровень выканання вельмі высокі. У кансерваторскія залы там прарвацца надзвычай складана, і вельмі добрыя музыканты выходзяць на вуліцу. У выніку ў берлінскай публікі добра «настроенае» вуха, і яна патрабуе сур'ёзнага ўзроўню выканання. Мы свой узровень не лічым нізкім, але чулі, хто іграў побач з намі — гэта былі прафесіяналы высокага класа. І яны не сароменліся выступаць на вуліцы!

Так наш герой і правёў свой сёлетні адпачынак. Уражанняў атрымаў шмат. Аляксей кажа, што, калі перасякалі мяжу, радаваліся: ура, мы ў Еўропе! Але за тыдзень паспелі засумаваць па родных мясцінах. І калі ехалі назад і зноў перасеклі мяжу, то ўжо крычалі: ура, мы дома! Таму што чужое ёсць чужое, а дом ёсць дом. Чужыя агні вабяць, але хутка надакучваюць, а сваё, роднае — не.

***

...Вось такое жыццё ў нашага героя. Не будзем перабольшваць — зусім не бязвоблачнае; але разам з тым — выклікае бязмерную павагу. Сам Аляксей — абаяльны, жыццярадасны, з добрым пачуццём гумару... Жонка выкладае ў музычнай школе, сын вучыцца ў 9 класе і наведвае мастацкую школу... Так што ўсё самае галоўнае ў жыцці нашага героя атрымалася. Выйшла ў яго — значыць, можа атрымацца і ў іншага.

***P.S.** На нашым сайце вы можаце пабачыць больш фотаздымкаў, а таксама паглядзець відэа з музычнымі выступленнямі Аляксея Сушанцова.*

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

**Фота з архіва героя.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск №36 (383)



■ На сцэне

# РЫТУАЛЬНЫ ТАНЕЦ У ГОНАР НОВАГА ЧАЛАВЕКА

## Аляксей Ляляўскі паставіў новы спектакль у Лялечным тэатры

**Мне падабаецца назіраць за дуэтамі акцёраў і лялек у спектаклях Аляксея Ляляўскага. Яны дзіўна суіснуюць: першыя нагадваюць малых дзяцей, паглыбленых у свет уласных фантазій, другія — у «крэйзі», замілавальным альбо смешным выглядзе — становяцца галоўнымі героямі сюжэтаў для дарослых. На гэты раз сюжэт не проста дарослы, у новай пастаноўцы Дзяржаўнага тэатра лялек «Mann ist Mann» паводле Бертольда Брэхта — прэм'ера спектакля адбылася 21 верасня — складаны бэкграўнд. П'еса, назва якой перакладаецца як «Чалавек ёсць чалавек», адсылае да Германіі пасля Першай сусветнай вайны, узыходжання гітлераўскай ідэалогіі і вымудраваных трансфармацый паняцця «чалавек». Але толькі тэарэтычна, бо мы ведаем, хто такі Брэхт, дзе і калі ён жыў. А на сцэне лялечнага брытанскія войскі ў брытанскай Індыі і партовы грузчык Гэлі Гэй, не здольны казаць «не».**

**Важна зразумець: маленькім чалавекам, што аказваецца пад адпаведным уздзеяннем, можаце быць вы, а ўмоўная машынерыя можа паглынуць свабоду на раз-два.**

Ёсць у целе самой п'есы нейкае вар'яцтва. Чацвёра салдат брытанскай арміі вырашылі пажывіцца ў пагадзе, але адзін з іх, Джэрая Джып, трапіў у пастку і пакінуў сляды — рыжыя валасы. Яго сябры вымушаны нешта прыдумаць, каб па слядах не выявіўся злачынца, і шукаюць некага, хто мог бы на вячэрняй паверцы замяніць п'янага, з праплешынай на галаве, Джыпа. Тут ім сустракаецца Гэлі Гэй, які насамрэч выйшаў па рыбу, але трапіў не ў тое месца і не ў той час. Яго нездольнасць казаць «не», відома, умоўная, не тое каб ён быў шчаслівы дапамагчы салдатам, але амаль вымушаны апрануць форму паспеў на гэтай аванцюры пажывіцца. Далей — больш. П'янага Джэрая Джыпа трымае бонза тыбецкай пагады ў надзеі, што ваеннае кіраўніцтва знойдзе злачынцу па яго адсутнасці, а салдаты зноў жа павінны звяртацца да Гэлі Гэя па дапамогу.

Шэраг абсурдыцкіх сцэн — і мы атрымліваем гісторыю пра пераробленага чалавека, пра сабраную па частках свядомасць, пра нетрываласць чалавека перад натоўпам. Гэлі Гэй з грузчыка, які пайшоў раніцай па рыбу, ператвараецца ў аднаго з найбольш крыважэрных салдат, з набярэжнай трапіў у салдацкі строй, яго паўсядзённая гулліваcць стала гульнёй са зброяй.

Што зрабіў Аляксей Ляляўскі, дык надаў гэтаму сюжэту яшчэ больш абсурду, прычым у нейкім рытуальным кірунку. Танцы і спевы, а на гэтай сцэне яны дадаюць абсурду, — добрае суправаджэнне для станаўлення новага чалавека. Глабальная перабудова — таму што ўсё, што датычыцца маленькага чалавека ў жорнах гісторыі, насамрэч глабальнае — адбываецца праз нязначны, нават жартаўлівы шэраг падзей. Каб падкрэсліць, што ператварэнне чалавека — гэта вынік не замоў злых геніяў альбо хімічных рэчываў у венах, а лёгкіх рухаў, варта было «раздрабніць» сюжэт п'есы на, здавалася б, нязначныя падзеі і дадаць яшчэ больш дробязяў, складнікаў кампазіцыі ў спектакль.

П'еса Бертольда Брэхта добра падыходзіць менавіта для лялечнага тэатра, нават з улікам таго, што, калі сам Брэхт ставіў «Mann ist Mann», ён выкарыстоўваў нешта падобнае — штучныя вобразы людзей, толькі ў вялікіх памерах. Дык вось, калі гаворка ідзе пра такое антыўтапічнае ўздзеянне на маленькага чалавека (грузчыка альбо падкрэслена амаль бессвядомай часткі наладжанай сістэмы), добра выкарыстоўваць лялек, якія на сцэне становяцца яшчэ і адпаведным сімвалам. Ёсць лялька, а ёсць той, хто з ёй гуляе, апранае і прыдумляе для яе гісторыю жыцця. Гэлі Гэй, што пахаваў самога сябе і назваўся чужым імем, стаў цацкай без волі і ўласнага шляху, і не толькі ён: нездарма ў спектаклі Ляляўскага галоўныя героі па чарзе са сваімі лялькамі выступаюць на першы план. Што штучны чалавечы вобраз, што ўласна чалавек — аналогія зразумелая.

**Шэраг абсурдыцкіх сцэн — і мы атрымліваем гісторыю пра пераробленага чалавека, пра сабраную па частках свядомасць, пра нетрываласць чалавека перад натоўпам.**

Затуманеная сцэна, танцы ў эстэтыцы абсурду, сімвалы ў спектаклі яскрава і ствараюць той патрэбны антыўтапічны матыў, у кантэксце якога гісторыя перабудовы чалавека выглядае найбольш арганічнай. І хоць сутнасць п'есы, бясспрэчна, найбольш падыходзіць рэфлексам Германіі 1920—1940-х, пастаноўка ў Лялечным — абсалютна сучасная, не толькі таму што «тэма вечная», а дзякуючы пэўным фармалісцкім рашэнням.

Фінальны выгук «Я Джэрая Джып» — напэўна, самы расчаравальны, затое моцны момант п'есы/спектакля, і рэжысёр «Mann ist Mann» прымусіў гэтага азначэння чакаць. Пачуцці, з якімі глядач наблізіцца да канчатковага сцверджання, напэўна, стануць для яго таксама вызначальным момантам (а гэтых праекцый дасягнуць дорага каштуе). Уласна я ўсё яшчэ спадзявалася, што ў варыянце Лялечнага Гэлі Гэй скажа, што ён Гэлі Гэй.

Важна зразумець: маленькім чалавекам, што аказваецца пад адпаведным уздзеяннем, можаце быць вы, а ўмоўная машынерыя можа паглынуць свабоду на раз-два. Што яшчэ важна — знайсці аналогіі ў розных, маленькіх і ўсюдыісных, сферах жыцця. Сучасныя тэхналогіі, «дрэнная кампанія», распаўсюджаныя перакананні — дайдзіце і да маштабаў алюзій самога Бертольда Брэхта. На шчасце, лялечны тэатр і Аляксей Ляляўскі, якія і без таго знаходзяцца ў якасных лідарах беларускага тэатра, зноў прадставілі пастаноўку, на якую білеты трэба набываць у першую чаргу. Каб чалавек быў усё ж чалавекам.


Фота Надзеі БУЖАН.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Свет музыкі

# Чароўныя гукі і новыя фарбы

## Чым філарманічныя музыканты заваёўваюць слухача?

**Тыдзень таму Беларуская дзяржаўная філармонія распачала новы сезон, які стаў васьмідзясятым у яе гісторыі. Але, па прызнанні саміх музыкантаў, сёлетнія канцэрты якасна не будуць адрозніваца ад мінулых, бо кожны год у філармоніі — святочны, а кампазітары і выканаўцы падчас кожнага выступлення шукаюць самы кароткі шлях да свайго слухача.**

Юбілейныя даты ў філармоніі ідуць паралельна: 30 гадоў дзейнічае Дзяржаўны камерны хор, 50 гадоў спаўняецца Дзяржаўнаму камернаму аркестру, 90-гадовы юбілей адзначае Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, а 70-гадовы — яго кіраўнік, дырыжор Аляксандр Анісімаў, які прызнаецца, што калектыў сёлета занадта запатрабаваны і бярэ ўдзел амаль ва ўсіх юбілейных канцэртах. Тым не менш гэты аркестр заўсёды ўмеў уражваць, вось і 26 кастрычніка на юбілеі свайго дырыжора музыканты выканаюць «Урачыстую месу» — твор, які ў Беларускай філармонііігралі толькі аднойчы.

Святкаванне юбілеяў працягнецца цыклам канцэртаў «Беларуская музычная восень». Гэта адзіная восень, дзе не будзе дажджу і пахмурнага надвор'я, а толькі найлепшая музыка і яе якаснае выкананне. Напрыклад, канцэртнымі праграмамі адзначаць юбілеі кампазітараў Дзмітрыя Смольскага, Віктара Войціка, Сяргея Бельцюкова, Андрэя Мдзівані: у выкананні вядучых калектываў філармоніі будуць гучаць найлепшыя сачыненні юбіляраў.

Безумоўна, ні адзін музычны сезон немагчымы без арганных канцэртаў, таму філарманічны цыкл «Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва» вяртаецца разам з новымі музыкантамі: польскім арганістам Маркам Маркушэўскім, музыкантамі Даніэлем Сальвадорам з Іспаніі і Ёганэсам Гефертам з Германіі. Не забыліся таксама і пра любімы беларускай публікай джаз: сёлета філармонія зноў супрацоўнічае з Польскім Інстытутам у Мінску, таму на сцэну завітаюць польскія джазмены, а таксама прадстаўнікі краіны, дзе нарадзіўся гэты кірунак, — амерыканскія музыканты.

Адной з самых доўгачаканых падзей музычнага жыцця беларускай сталіцы зноў становіцца Міжнародны фестываль Юрыя Башмета, які пройдзе ў Мінску ўжо дванаццаты раз! Шэраг канцэртаў адбудзецца ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі, у тым ліку і самы грандыёзны: адзін з класікаў сучаснасці, кампазітар і дырыжор Кшыштаф Пендэрэцкі ўпершыню будзе дырыжыраваць сімфанічным аркестрам Беларусі на мінскай сцэне.

Беларускія музыканты таксама падрыхтавалі шмат сюрпрызаў. Напрыклад, мастацкі кіраўнік народнага аркестра імя І. Жыновіча Міхаіл Казінец расказаў, што калектыў вырашыў аддаць увагу творчасці, якая згубілася ў часе: «Раней мы аднавілі «Гусляра» Мулявіна, а зараз звярнуліся да бессмяротнага «Вянка» Максіма Багдановіча, які складаецца з пятнаццаці кампазіцый на вершы паэта».

Фальклорныя праграмы ў юбілейным сезоне падрыхтуюць таксама калектывы «Купалінка», «Свята», «Харошкі», выступяць маладыя піяністы і вакалісты. Адной з самых нечаканых падзей будзе новы праект камернага хора. Ён створаны кампазітарам Ларысай Сімаковіч, якая таксама з'яўляецца сцэнарыстам, рэжысёрам, харэографам і лібрэтыстам. Без сумнення, перформанс будзе канцэптуальным: твор з сімвалічнай назвай «Плошча Якуба Коласа», напісаны ў жанры харавога тэатра, будзе не толькі вартым падарункам паэту-юбіляру, але і эксперыментальным праектам: аб жыцці Коласа слухачы даведаюцца праз музыку.

Для філармоніі новы сезон будзе адзначаны не толькі шэрагам канцэртаў, але і спробай дадаць у музычнае жыццё краіны новыя фарбы: сёлета плануецца стварыць канцэртную пляцоўку пад адкрытым небам побач з філармоніяй, заснаваць Алею зорак, а таксама выдаць кнігу пра філарманічнае жыццё за апошнія пятнаццаць гадоў.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР

■ Асоба

## Ігар КУЛІКОЎ:

# «БАЛІВУД — АРГАНІЧНЫ ПРАЦЯГ СТАРАЖЫТНАЙ ІНДЫЙСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

**Пакуль самі індыйцы часам лепш ведаюць серыял «Махабхарата», чым літаратурную «Махабхарату», у нашай краіне распаўсюджваецца цікавасць да індыйскай культуры. І з'яўленне перакладаў з санскрыту на беларускую мову тут вельмі своечасовае. Больш за год таму паэт Ігар Кулікоў завяршыў працу над паэтычным перакладам аднаго з найстаражытнейшых літаратурных твораў: на беларускай мове з'явілася першае кола індыйскага зборніка гімнаў багам Рыгведа. Сам перакладчык казаў, і я з ім пагаджуся, што наяўнасць Рыгведы на нацыянальнай мове робіць пэўны гонар нашай культуры. Нават калі перакладзены не ўсе дзесяць так званых мандалаў (частак), з якіх складаецца зборнік. Затое ўжо хутка Ігар КУЛІКОЎ прадставіў пераклад паэмы «Воблачны вястун» індыйскага Шэкспіра — старажытнага санскрыцкага паэта і драматурга Калідасы. Цяпер паэт працуе над найбольш цытаваным дзясятым колам Рыгведы і п'есай Калідасы «Шакунтала пазнаная», а мы размаўляем з ім пра яго перакладчыцкую дзейнасць.**



***— Ужыванне санскрыту ў сучаснасці даволі абмежаванае, а хіндзі — адна з афіцыйных моў Індыі. Чаму вы вырашылі авалодаць менавіта санскрытам?***

— Вучыць хіндзі варта, калі вы хочаце пазнаёміцца з сучаснай Індыяй, глядзець балівудскія фільмы і слухаць папулярныя песні, але індыйская культура будуецца на санскрыце, на ім напісаны галоўныя філасофскія і паэтычныя тэксты. Я называю санскрыт паўмёртвай мовай: сёння ім валодае каля мільёна індыйцаў, існуе нават эксперыментальная вёска з насельніцтвам каля дзесяці тысяч чалавек, дзе размаўляюць толькі на санскрыце. Праўда, для побытавага ўжывання яго лексіка абмежаваная (напрыклад, тут няма слэнгу), таму ім пераважна карыстаюцца, размаўляючы на высокія тэмы. Доўгі час у Індыі паміж мовамі былі падзелены сферы ўжывання: людзі кантактавалі на народных мовах, а філасофія, паэзія, навуковыя тэксты пісаліся на санскрыце, а з той нагоды, што ў народных мовах пэўная лексіка не распрацоўвалася, а запазычвалася, сучасныя мовы Індыі вельмі санскрытазаваныя. А хіндзі, хоць на ім размаўляе больш за дзвесце мільёнаў чалавек, занепадае і разбураецца пад націскам часова дзяржаўнай у Індыі англійскай: яна засмечваецца англіцызмамі, часта самі індыйцы не могуць чытаць на хіндзі, бо не валодаюць ім на дастатковым узроўні. Прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі спрабуе змяніць сітуацыю і стараецца не выкарыстоўваць англійскую, але часам нават не знаходзіцца спецыялістаў, якія б маглі перакладаць на нямецкую, французскую альбо рускую менавіта з хіндзі. У Індыі безліч моў: больш за 1600 увогуле і 22 дзяржаўныя. У кожным буйным штаце ёсць свая мова, якая можа як неба і зямля адрозніваца ад таго, што гучыць у іншым рэгіёне. На поўдні Індыі размаўляюць на дравідыйскіх мовах, ніяк не звязаных з індаеўрапейскай моўнай сям'ёй, распаўсюджанай на поўначы краіны. У Мінску даволі шмат людзей на розных узроўнях валодае хіндзі, асабіста ведаю прынамсі трох выкладчыкаў. У нашай сталіцы высокая цікавасць да індыйскай культуры, я сам выкладаю санскрыт і кожны год у мяне займаецца па чалавек пяць — хтосьці цікавіцца будызмам, хтосьці ёгай, хтосьці проста індыйскай філасофіяй.

**«Санскрыцкая паэзія перанасычана метафарамі, параўнаннямі, алітэрацыяй, этымалагічнай гульнёй. Паэт абавязкова павінен паказаць, што ён ведае шмат паэтычных прыёмаў».**

***— А вы разумееце хіндзі?***

— Няблага чытаю са слоўнікам філасофскія тэксты, дзе шмат санскрытызмаў, праўда з газетамі сітуацыя іншая, таму што ў сучасным хіндзі шмат іранскай і арабскай лексікі, бо Індыя доўгі час была пад мусульманскім кіраваннем, якое карысталася персідскай мовай, што ў сваю чаргу зазнала ўплыў арабскай. Арабізмы і іранізмы ў хіндзі ўжываюцца паўсядзённа, іх трэба вучыць асобна, а ў навуковых тэкстах іх стараюцца пазбягаць.

***— Колькі прайшло часу ад пачатку вывучэння санскрыту да перакладу Рыгведы?***

— Каля чатырох гадоў, але я працягваю вучыць санскрыт дагэтуль.

***— Пераклады індыйскіх старажытных філасофскіх твораў часцей існуюць у прозе. Чаму вы ўзяліся перакладаць Рыгведу ў вершаванай форме?***

— У Рыгведзе ёсць думка, што потым развілася ў індыйскай філасофіі, але строга кажучы, гэта не філасофскі твор, а зборнік гімнаў, прызваных залагодзіць багоў і атрымаць нешта наўзамен. Ёсць тут замовы — супраць хвароб і для рытуалаў, што дагэтуль практыкуюцца ў індыйскай магіі. Гэта можа падацца вар'яцтвам, але магія сапраўды дзейнічае, мой знаёмы ёй валодае, можна нават знайсці настаўніка, каб гэтаму навучыцца. Рыгведу, як і іншыя вершаваныя старажытныя тэксты, перакладаюць прозай дзеля дакладнасці, літаральнасці, гэта навуковы падыход. Тым больш у тэксце шмат слоў, значэнне якіх невядомае і ніколі не будзе вядомым, бо мы не валодаем культурнымі рэаліямі таго часу. Але першы англійскі пераклад, зроблены яшчэ ў XIX стагоддзі, — паэтычны. Паэтычныя пераклады Рыгведы ёсць на французскай і нямецкай, урыўкі перакладаліся на рускую і ўкраінскую. Шмат з тых варыянтаў ужо састарэлі, іх інтэрпрэтацыя абвергнута навукай, нядаўна нават выйшаў новы — празаічны — пераклад Рыгведы на англійскую мову.




**«Я хацеў перакласці Рыгведу ў вершаванай форме, бо гэта ў прынцыпе класная паэзія, да таго ж створаная мінімум тры з паловай тысячы гадоў таму, што само па сабе цікава — дакрануцца да свядомасці тых людзей».**

***— Значыць, можна сказаць, твор у вершаваным перакладзе нешта страчвае.***

— Вазьміце любы паэтычны пераклад, і вы ўбачыце, што ён значна адрозніваецца ад арыгінала, гэта нармальна, проста ў аўтараў розныя мэты. Каб атрымаць асалоду і ўяўленне пра культуру — выбірайце паэтычны пераклад, калі трэба нешта дакладнае для цытавання — бярыце літаральны падрадковы, а калі хочаце сур'ёзна заняцца індыйскай культурай — вучыце санскрыт. Расійскі пераклад чытаць вельмі складана: ён дакладны і не валодае мастацкімі якасцямі. Я не планаваў рабіць свой тэкст часткай навуковага дыскурсу, нікому акрамя пары навукоўцаў нецікавага, у мяне была задача ўвесці яго ў кантэкст індыйскай культуры, я хацеў перакласці Рыгведу ў вершаванай форме, бо гэта ў прынцыпе класная паэзія, да таго ж створаная мінімум тры з паловай тысячы гадоў таму, што само па сабе цікава — дакрануцца да свядомасці тых людзей.

***— Вы казалі, што пры перакладзе даводзілася ствараць шмат наватвораў.***

— Лексіка, звязаная з філасофіяй і рэлігіяй, у санскрыце распрацаваная лепш, чым у беларускай мове. Я магу ўжываць запазычаныя словы, напрыклад, з лацінскай, але гэта не адпавядае арыгіналу, тым больш, што словы ў індыйскай літаратуры ўвесь час лагічна абыгрываюцца, а я не магу гэта перакласці, выкарыстоўваючы запазычанае слова. Таму прыходзіцца недзе падбіраць існуючае слова, а недзе ствараць сваё.

***— Я чула тэорыі, якія на падставе моўных сувязяў паміж санскрытам і беларускай мовай сцвярджаюць пра гістарычную сувязь нашых культур, нехта нават казаў, што беларуская мова і ёсць па сутнасці санскрыт. Ці заўважылі вы, як перакладчык, падставы так меркаваць?***

— Гэта несур'ёзна, не варта тых людзей слухаць. Беларуская і санскрыт належаць да індаеўрапейскай моўнай сям'і, адсюль нешта агульнае ў склонах, парадку слоў і лексіцы. У нас столькі ж агульнага з літоўскай, нямецкай альбо лацінскай мовамі, але гэта не заўсёды значыць, што мы, як этнасы, уплывалі адзін на аднаго. Славянскія мовы дастаткова архаічныя, яны змяніліся не так моцна, як, скажам, нямецкая: у нас захаваліся склоны, а, напрыклад, у англійскай, што таксама належыць да індаеўрапейскай моўнай сям'і, яны зніклі. Таму нельга сказаць, што ў беларускай нейкія таемныя сувязі з санскрытам, якіх няма з іншымі мовамі. Літоўская, магчыма, да санскрыту яшчэ бліжэйшая, бо ў ёй захавалася шмат архаізмаў. У цэлым санскрыт падобны да беларускай больш чым, скажам, да нямецкай, хоць у нямецкай, як і ў санскрыце, ёсць складаныя словы з некалькіх каранёў (у нас два, максімум тры карані).

***— Вы распачыналі пераклад Калідасы наноў. Чаму?***

— Спосаб індыйскага вершаскладання моцна адрозніваецца ад беларускага, немагчыма проста перакласці санскрыцкі паэтычны памер. Калі перакладаеш з англійскай — там ямб, значыць, і тут ямб, ніякіх праблем. Працуючы з санскрытам, трэба знаходзіць спосаб імітаваць індыйскі памер, але спачатку я вырашыў гэтага не рабіць, выбраць іншы, дзе б супадала колькасць складоў, і проста перадаць сэнс. Так рабілі іншыя перакладчыкі. Але праз некаторы час я зразумеў, што рытмічны малюнак можна зрабіць бліжэйшым да арыгінала, таму прыйшлося ўсё перапісаць. Санскрыцкая паэзія не чытаецца — яна спяваецца рэчытатывам, таму ў ідэале трэба зрабіць такі пераклад, які б можна было праспяваць.

**«У нашай сталіцы высокая цікавасць да індыйскай культуры, я сам выкладаю санскрыт і кожны год у мяне займаецца па чалавек пяць — хтосьці цікавіцца будызмам, хтосьці ёгай, хтосьці проста індыйскай філасофіяй».**

***— У індыйскай літаратуры мне кідаецца ў вочы яе надзвычайная паэтычнасць. А якія асаблівасці вы б адзначылі, параўноўваючы індыйскую літаратурную традыцыю з больш нам знаёмай?***

— Індыйская літаратура, скажам так, вельмі правільная. Існуюць навуковыя трактаты з парадамі, як пісаць вершы, якімі памерамі, якія ўжываць віды метафар і мастацкія сродкі ўвогуле. Таму паэзія на санскрыце вельмі фармалізаваная, яна робіцца па правілах, тут няма такой аўтарскай індывідуальнасці, як у Еўропе, дзе ў кожнага свае паэтычныя хады. Гэта можна любіць і адначасова не любіць, бо бывае, гэта настолькі надакучвае, што больш чытаць не хочацца. Тэматыка таксама фармалізаваная: у трактаце па тэатральным мастацтве прапісана, на якія тэмы можна пісаць п'есы. Трагедыі згодна з ім пісаць не варта, бо літаратура павінна ў першую чаргу павучаць, у Індыі няма свайго Сафокла. Фактычна да нас дайшла толькі адна п'еса, галоўны герой якой у канцы паміраe, бо звычайна ўсё канчаецца хэпі-эндам. Санскрыцкі паэт абавязкова павінен паказаць, што ён ведае шмат паэтычных прыёмаў, паэзія перанасычана метафарамі, параўнаннямі, алітэрацыяй, этымалагічнай гульнёй. Калі ты напісаў паэму ў адным памеры — ты лох, а не майстар. Трэба праяўляць сябе менавіта ў майстэрстве, індыйская літаратура не імкнецца да знаходак, а перадае традыцыю. Што датычыцца глыбіні думкі, часам чытаеш і захапляешся. Традыцыйны сюжэт з Махабхараты, які ў першакрыніцы займае тры старонкі, новы аўтар можа расцягнуць на дзвесце за кошт падрабязнага апісання войска князя, аповеду, як ваенны лагер тыдзень стаяў, што ён рабіў, як герой паляваў, гнаўся за жывёламі і колькі іх забіў, на старонку — як на яго паглядзела красуня. Гэта як балівудскія фільмы, што еўрапейскаму гледачу глядзець складана, а з пункту гледжання індыйцаў гэта супер выкшталцона. Балівуд — увогуле арганічны працяг старажытнай індыйскай літаратуры.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
katsyalovich@zviazda.by

■

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» по поручению Минского районного исполнительного комитета проводит повторный открытый аукцион по продаже **единого предмета аукциона** в составе:

**Право заключения договора аренды земельного участка для строительства автозаправочной станции с комплексом дорожного сервиса** с кадастровым номером 623680601601000837 площадью **3,9305 га**, расположенного по адресу: Минский район, Боровлянский с/с, **д. Валерьяново.** Земельный участок для строительства автозаправочной станции с комплексом дорожного сервиса будет передан в аренду сроком **на 30 лет.**

**Не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение *(торгово-офисное здание)*,** общей площадью 20 664,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623680601601000837 по адресу: Минский район, Боровлянский с/с, д. Валерьяново.

**Начальная цена единого предмета аукциона – 2 650 860,35 бел. руб. *(два миллиона шестьсот пятьдесят тысяч восемьсот шестьдесят белорусских рублей 35 копеек) (Стоимость снижена на 80%).***

**Задаток 10% от начальной цены – 265 086,00 бел. руб. *(двести шестьдесят пять тысяч восемьдесят шесть белорусских рублей 00 копеек).***

Расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, составляют **69,00 бел. руб. (шестьдесят девять белорусских рублей 00 копеек).**

**Продавец – Минский районный исполнительный комитет, контактный телефон (017) 204 35 25.**

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, выразивший согласие на приобретение единого предмета аукциона как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, **в течение 10 рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией договора аренды земельного участка и возникновения основанного на нем права **обязан:**

– внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

– возместить Минскому райисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий и представления организатору аукциона и в Минский районный исполнительный комитет копий платежных документов, но **не позднее 2 рабочих дней**, между победителем (единственным участником) аукциона и Минским районным исполнительным комитетом **заключается договор купли-продажи не завершенного строительством незаконсервированного объекта**.

**В тот же срок** Минский районный исполнительный комитет передает победителю (единственному участнику) аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и выдает экземпляр протокола для **заключения договора аренды земельного участка с Боровлянским сельским исполнительным комитетом.**

Оплата по договору купли-продажи за **не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение** производится **в течение 30 дней** с момента заключения договора купли-продажи.

**Условия аукциона в отношении продажи не завершенного строительством незаконсервированного капитального строения:**

победитель (единственный участник) аукциона **в течение 2 месяцев** с момента заключения договора купли-продажи обязан обеспечить приведение в надлежащее состояние территории (ограждение, уборка мусора, окос травы и др.);

строительство осуществляется в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией и в пределах установленных нормативных сроков строительства;

победитель (единственный участник) аукциона **в течение 30 дней** с момента заключения договора купли-продажи обязан заключить инвестиционный договор с Минским областным исполнительным комитетом.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.05.2016 № 370.

**Аукцион состоится 20.10.2017 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, 324, по 18.10.2017 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

**Контактные телефоны организатора аукциона: + 375 (17) 205-46-61, +375 (17) 207-71-34.**

**Задатки перечисляются не позднее 18.10.2017 г. на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (задатки) не позднее 18.10.2017 г.;**

**представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение единого предмета аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

# Извещение о проведении аукциона Зябровский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельного участка в частную собственность, расположенного на территории Зябровского сельсовета

| Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Начальная цена предмета аукциона | Затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета |
|---|---|---|---|---|
| 321083603601000307 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1125 га, Гомельская область, Гомельский район, п. Кореневка, ул. Зеленая, участок №8 | водопровод, канализация, электроснабжение, связь, асфальтированный подъезд | 11 524,61 (Одиннадцать тысяч пятьсот двадцать четыре рубля 61 копейка) | Расходы в сумме 1 589,43 (Одна тысяча пятьсот восемьдесят девять рублей 43 копейки) и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 1 152,46 (Одна тысяча сто пятьдесят два рубля 46 копеек) на р/с BY63AKBB36044141000163100000 в филиале №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель – Зябровский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901 |

**Аукцион проводится 4 октября 2017 года в 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, в административном здании Гомельского райисполкома (малый зал, 3-й этаж).**

**Заявление об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, деревня Зябровка, ул. Комсомольская, 30, 1-й этаж, кабинет 2 с даты опубликования по 03.10.2017 с 8.30 до 17.00, обед 13.00–14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.**

Условия для участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Зябровским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

Письменный отзыв заявления или неявка участника участников аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право приобретения земельного участка в частную собственность;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и приобретением участниками документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. в течение двух месяцев, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам аукциона предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

Справки по адресу: Гомельский район, деревня Зябровка, ул. Комсомольская, 30, тел.: 94-95-45, 94-96-00.

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | – капитальное строение, инв. №450/С-1784 (назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – цех по производству гофротары), площадью 204,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 3А; – капитальное строение, инв. №450/С-1783 (назначение – здание нежилое, наименование – склад), площадью 29,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1; – капитальное строение, инв. №450/С-28498 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – газопроводная сеть), протяженностью 34,1 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; – капитальное строение, инв. №450/С-28500 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 2,7 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; – капитальное строение, инв. №450/С-28501 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – кабельная линия электропередачи напряжением 10 кВ), протяженностью 114,3 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; – капитальное строение, инв. №450/С-28499 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 31,7 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; – котел газовый АОГВК-354-1 (установлен в здании цеха по производству гофротары); – система средств охранной сигнализации – приемо-контрольный прибор «АЛАРМ-5» с выходом на пульт центрального наблюдения Слонимского ОДО МВД РБ и объемные извещатели ИНС-110 в помещениях (установлено в здании цеха по производству гофротары) |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | кадастровый номер 425450100001000400 (назначение – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности), площадью 0,0905, расположенном по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1 |
| **Начальная цена продажи** | 30 576 р. (тридцать тысяч пятьсот семьдесят шесть рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 057 р. (три тысячи пятьдесят семь рублей) |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | упаковщик пластиковой лентой СТ900Т (предназначен для обвязки пластиковой лентой коробок, пачек, мебели, картона, производительность 20 циклов/мин) |
| **Начальная цена продажи** | 324 р. (триста двадцать четыре рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 32 р. (тридцать два рубля) |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | полуавтомат роторно-просекательная машина ВК940*2000 для изготовления гофротары (предназначен для высечки картонного кроя) |
| **Начальная цена продажи** | 11 952 р. (одиннадцать тысяч девятьсот пятьдесят два рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 195 р. (одна тысяча сто девяносто пять рублей) |
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | станок для двухцветной флексопечати С2ФМ (предназначен для нанесения одно-двухцветной флексопечати на многослойный картон, производительность 1500 листов/час) |
| **Начальная цена продажи** | 8064 р. (восемь тысяч шестьдесят четыре рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 806 р. (восемьсот шесть рублей) |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Продавец** | Филиал «Слонимский хлебзавод» ОАО «Гродно-хлебпром» 231800, г. Слоним, ул. Чкалова, 6, 8-01562-503-31 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 25 октября 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 19 октября 2017 г. до 15.00**
**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**http://grodnoino.by/**

■ Рэзанансная публікацыя

# ЯК «ЗВЯЗДУ» ХАВАЛІ АД ПЕДАГОГАЎ...

У журналісцкай практыцы так здараецца: доўга збіраеш інфармацыю для нейкага артыкула, выслухваеш розныя бакі, выязджаеш у камандзіроўку, уяўляеш, які рэзананс можа выклікаць твая будучая публікацыя, але па факце замест шторму атрымліваецца лёгкі брыз. Але бывае і інакш. 2 сакавіка 2010 года ў «Звяздзе» выйшаў мой артыкул «Прыцягальнасць прафесіі педагога ў грамадстве імкліва зніжаецца», прысвечаны пытанням, якія ўздымаліся на сумеснай калегіі Міністэрства адукацыі і Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Размова ішла пра нізкія заробкі настаўнікаў, неабходнасць замацавання ва ўстановах адукацыі маладых спецыялістаў, смехатворныя выплаты педагогам на метадычную літаратуру, псіхалагічнае становішча ў калектывах пасля пераводу педагагічных работнікаў на кантрактную форму найму... Пісала я пра гэта і раней. Праз тыдзень атрымліваю ліст ад «настаўніка адной са школ Віцебскай вобласці». Менавіта так ён падпісаўся. Але, нягледзячы на яго ананімнасць, праігнараваць такі крык душы мы не мелі маральнага права. Педагог пісаў: *«З цікавасцю прачытаў артыкул Надзеі Нікалаевай... Шмат думак узнікае на гэты конт. Нельга не пагадзіцца з аргументамі пра павышэнне статусу педагогаў, аднак хочацца адзначыць тое, што рэальнае вырашэнне праблемы ажыццяўляецца занадта марудна. Пакуль Міністэрства адукацыі будзе павышаць статус педагогаў на ўзроўні дэкларацый, школа страціць сапраўдных Настаўнікаў. Зразумела, што педагогам чалавек павінен станавіцца не выпадкова, што настаўнік павінен быць высокамаральным чалавекам. Аднак тыя абставіны, у якіх знаходзяцца сучасныя педагогі большасці агульнаадукацыйных навучальных устаноў, не самым лепшым чынам спрыяюць павышэнню прафесійнай кампетэнтнасці і духоўнасці настаўнікаў....*

*Як жа Міністэрства адукацыі збіраецца фарміраваць «высокапрафесійнае асяроддзе» пры такім стане рэчаў, калі зарплата настаўніка і прыбіральшчыцы на пасляхоўным прадпрыемстве практычна аднолькавая, а часам у прыбіральшчыцы і больш высокая?..»*

Наш ананімны аўтар прыцягнуў увагу да многіх вострых момантаў, пра якія не прынята было казаць уголас, і завяршыў сваё пасланне наступнымі словамі: *«Магчыма, мой ліст і не будзе надрукаваны, бо прозвішча сваё не пакідаю. І не папракайце, калі ласка, мяне ў маладушнасці і непрынцыповасці, бо на нязгодных заўсёды знаходзіцца ўправа (ды яшчэ якая!). Магу сказаць толькі, што пад гэтым лістом падпісалася б дастатковая колькасць маіх калег».*

Але мы гэты ліст надрукавалі і запрасілі педагогаў далучыцца да дыскусіі, паабяцаўшы прааналізаваць усе крытычныя заўвагі разам з Міністэрствам адукацыі. Тое, што адбылося далей, інакш як выбухам не назавеш: абмеркаванне на нашым сайце доўжылася паўтара года. Настаўнікі пакідалі свае каментарыі, пісалі ў газету, — у мяне па сённяшні дзень захоўваецца папка з лістамі, напісанымі ад рукі. Гэта былі часы, калі людзі яшчэ давяралі свае думкі паперы... А «Звязда» з нумара ў нумар затым друкавала самыя цікавыя допісы на сваіх старонках, за што дзякуй смеласці і прынцыповасці нашага колішняга галоўнага рэдактара. І ўжо гэтыя публікацыі выклікалі новую хвалю думак і меркаванняў.

Прывяду толькі некаторыя з іх:

- «Працую ў школе, таму магу сцвярджаць, што кожнае сказанае слова — абсалютная праўда. Крыўдна і прыкра. Не могуць людзі, якія адчуваюць сябе непаўнавартымі, выхаваць самадастатковых людзей».
- «Я проста здзіўлены, што «Звязда» адважылася падняць такую балючую тэму. Гонар вам і мае сімпатыі! Дарэчы, я ведаю, што ў адной са школ адміністрацыя хавае нумар «Звязды» ад 17 сакавіка, каб педагогі не змаглі пабачыць разважанні настаўніка з Віцебшчыны на свае ўласныя вочы. Вось табе і галоснасць! Але ўсё роўна ў педкалектыве ідзе гарачае абмеркаванне гэтай праблемы. Трэба аб'ядноўвацца, каб Міністэрства адукацыі пачало нешта рэагаваць на выкарыстанне настаўнікаў у якасці затычак ва ўсе дзіркі».
- «Прыязджаў нядаўна ў нашу школу інспектар ДАІ. Застаўся незадаволены адсутнасцю дзіцячых малюнкаў на тэму правілаў дарожнага руху. А настаўнікам сказаў, што тыя пойдуць даіць на ферму кароў. Мы і падумалі, што на ферме з намі праблем не будзе: да сваіх абавязкаў мы будзем ставіцца добрасумленна: гарэлку не п'ём, не курым, выхаваныя, адукаваныя. Карацей кажучы, не прападзём. Можа, хоць там скажуць нам дзякуй за працу?»
- «Гатовы падпісацца пад кожнаю літараю артыкула пра становішча настаўнікаў. Крыўдна, горка. А калі ў сям'і два настаўнікі? Раней мы ганарыліся сваёй прафесіяй, а цяпер пры незнаёмых людзях сорамна прызнацца, што ты школьны настаўнік. Шчыры дзякуй «Звяздзе» за праўду».
- «Хто калі-небудзь цікавіўся дзецьмі настаўнікаў і тым, як яны выхаваныя? Самыя гаротныя дзеці — настаўніцкія!!!! Матуля па тэлефоне кіруе лячэннем, расказвае, як прымаць таблеткі, дае парады, як суп варыць. З хатнімі заданнямі да мамы-настаўніцы і не падыходзь, бо ад школы млосна. Трэба быць цяглавым канём, каб цалкам аддавацца рабоце. Але на першым месцы павінна быць, я лічу, сям'я (муж, дзеці) і здароўе. Калі вы — жанчыны, так і будзьце імі! А вашы вымовы ад раённага аддзела адукацыі нікуды не падзенуцца...»
- «Вы б пабачылі, колькі спускаюць розных загадаў, конкурсаў і г. д. А не прымеш удзел, значыць, ты не працуеш. Настаўнік чым толькі не павінен займацца, а калі ж займацца падрыхтоўкай урокаў? І, самае галоўнае, ніхто цябе слухаць не жадае...»
- «Псіхалогію настаўніка, сфарміраваную яшчэ з часоў савецкай школы, змяніць няпроста. Калі ў нашу школу ўваходзіць начальнік аддзела адукацыі, усе імкнуцца знікнуць, таму што не абаронцу і не прадстаўніка сваіх інтарэсаў бачаць у ім, а «караючую дясніцу». А той сам не з усімі вітаецца, але абураецца: «Дрэнна выхоўваеце дзяцей, яны са мной не вітаюцца!» Усе вакол ведаюць, як вучыць і выхоўваць дзяцей, даюць бясконцыя метадычныя рэкамендацыі, а настаўнік толькі згодна ківае галавой, робіць аналіз і складае справаздачы, фальсіфікуе вынікі вучэбнай і выхаваўчай работы (крый божа, каб тыя былі горшыя, чым у папярэднім годзе), піша бясконцыя праекты, нарысы, вершы і цягне непасільную ношу адказнасці за жыццё і здароўе вучня ў школе, па дарозе са школы дамоў, дома, на вуліцы, на дыскатэцы. І паспрабуй абурыцца! Усё пастаўлена з ног на галаву».
- «Я працую ў школе ўжо больш як 15 гадоў, і я хачу вучыць дзяцей. Маркую, што і ім мая работа падабаецца. Але паверце, мяне забівае, што мая дарослая дачка ўжо каторы год глядзіць на мяне з жалем. А што будзе далей?»
- «Як я ў дзяцінстве ганарылася, што мая маці — настаўніца! Сама пайшла па гэтай сцяжынцы. А цяпер... Пакажыце мне нармальную маці, якая ДОБРААХВОТНА кіне сваіх непаўналетніх дзяцей і ўначы пойдзе дзяжурыць на дыскатэку. І мужа, які адрэагуе на гэта спакойна. Тым больш што такія дзяжурствы ніяк не аплачваюцца. Ты толькі нясеш адказнасць за ўсіх і ўсюды. Бацькі на дыскатэку дзіця адпусцілі, а ты павінен сачыць за іх дзіцем. А калі, крый божа, што з ім здарыцца, то бацькі будуць пацярпелымі, а школа, якая за вучнем не дагледзела, вінаватая. Абсурд!»
- «Удзячныя рэдакцыі вашай газеты за смеласць, а калі што-небудзь пасля публікацый зрушыцца з месца, то нізкі паклон вам ад настаўніцтва!»

***Ці зрушылася штосьці з месца? На жаль, не. Педагогі па-ранейшаму сігналізуюць пра невыносную забюракратызаванасць сваёй працы, усё новыя і новыя абавязкі, якія ў іх з'яўляюцца, пра свае сціплыя заробкі, якія ўжо даўно не павышаліся...***

***Атрымліваецца, што іх не пачулі?***

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Каб ніколі болей...

# ЗА 15 КРОКАЎ АД СМЕРЦІ

**«Выбух прагрымеў прыкладна ў 17.54. За дакладнасць гаварыць не буду, мяркую па гадзінніку на сваім мабільным тэлефоне. Цягнік якраз пад'ехаў да станцыі «Кастрычніцкая», дзверы расчыніліся...» Па волі выпадку 11 красавіка 2011 года мне давялося апынуцца побач з месцам выбуху. У першыя секунды падалося, што са столі ўпала велізарная люстра. Вагон пад нагамі закачаўся, святло пагасла, але не зусім...**




Дагэтуль памятаю той дзень. Жонка ў канцы папярэдняга працоўнага тыдня захварэла, за выхадныя канчаткова не ачуняла. Ледзьве ўгаварыў застацца дома ў панядзелак — далячыцца. Абяцаў прыйсці з работы крыху раней. І ўжо збіраўся, як патэлефанавала жанчына з аднаго з райцэнтраў. Сям'я губляла надзею паблукаваць сваё жылле: нешта не так было з афармленнем дакументаў, а тэрміны моцна націскалі. Я крыху павагаўся — можа, заўтра заняцца гэтым пытаннем? — але ўсё ж набраў нумар... З работы выйшаў амаль што як звычайна і, так атрымалася, сеў у той самы цягнік.

...У першыя дні мне падавалася, што я нічога асабліва не бачыў. Памяць пачала вяртацца крыху пазней. ...Выйшаў з вагона направа па ходу руху, праз некалькі крокаў скрозь пыл заўважыў дзірку ў пероне, з якой тырчала, як падалося, арматура, нейкія раскіданыя рэчы. І сілуэты людзей на падлозе... На паўсагнутых нагах развярнуўся налева, прайшоў пад аркай лесвіцы пешаходнага пераходу ў бок эскалатараў. Людзей побач амаль не было, здавалася, я тут адзін. У паветры пахла паленым жалезам, пад нагамі нейкія цёмныя плямы дарожкай. Эскалатары працавалі, тут было даволі многа пасажыраў, якія таропка набіралі нумары тэлефонаў. У галаве мільганула думка, што сувязь зараз «ляжа», таму спешна дастаў свой.

Набраў жонку, коратка сказаў, што ў метро нешта здарылася, але са мной усё ў парадку, няхай не хвалюецца. Потым пачаў тэлефанаваць брату. На той момант ён працаваў на гэтай самай «Купалаўскай» і адказваў за той самы эскалатар, які вёз мяне наверх. «Саня, ты дзе? На змене? Дома! У метро нешта здарылася, я пакуль не ведаю, што...» У сваю наступную начную змену брат будзе за руку пераводзіць з аднаго краю перона на другі прыбіральшчыцу: жанчыне было так страшна...

Каля выхаду з пераходу побач з Домам афіцэраў у першыя хвіліны было адносна няшмат людзей, некалькі дзясяткаў. Тое ж можна было назіраць і цераз дарогу насупраць другога выхаду з метро. На лаўку пасадзілі адну з пацярпелых, пажылую жанчыну, якой спрабавалі выцерці ад крыві твар. Нехта ў прастрацыі прытуліўся да мармуру выхаду. Побач нервова тудысюды хадзіла маладая жанчына з закопчаным тварам, якая ўвесь час нешта гаварыла ў мабільны тэлефон. Яе спадніца чорная да паловы спераду і ззаду. Каля каменнага парапета бязгучна плакала іншая рыжавалосая маладая дзяўчына. На правай назе ў яе каля калена была кроў.

У першыя хвіліны транспарт працаваў як звычайна. З паўпустых «сотак» на прыпынкі з неўразуменнем пазіралі пасажыры. З боку цырка пад'ехала першая пажарная машына, яшчэ праз хвіліну падляцелі дзве хуткія дапамогі. Разумеючы, што зараз «ляжа» не толькі сувязь, але і ўтворыцца транспартны калапс, вырашыў ехаць у рэдакцыю. У аўтобус усе ледзьве ўціснуўся. Сярод пасажыраў былі людзі са слядамі крыві, бруду на тварах, вопратцы. У салоне адчувалася напружанне, чуліся словы: «метро», «выбух»... Яшчэ ніхто нічога да канца не зразумеў. І тым не менш усё ў той жа «сотцы» ад некага ўпершыню прагучала: тэракт... Гэта было хвілін праз дваццаць пасля выбуху. На наступных прыпынках была процьма людзей, пасажыры з вялікай цяжкасцю ўціскваліся і выходзілі з аўтобуса. Было зразумела, што метро зачынена. Па абодвух баках праспекта ішлі людзі. Ледзьве выйшаў з транспарту. За нейкіх сто метраў да рэдакцыі ногі раптоўна сталі ватнымі... Калі падняўся на «звяздоўскі» паверх у Доме прэсы, мабільнай сувязі ўжо не было. Сабраўшыся з духам і выходзячы праз кожныя некалькі хвілін пакурыць, я пачаў надыктоўваць машыністцы матэрыял у нумар. Уласныя рукі дрыжэлі, у галаве была суцэльная мешаніна. На нервовай глебе аўтаматычна зачыніў кабінет, а ключы засталіся ўнутры ў куртцы. Дадому мяне завёз увечары калега. Там я яшчэ доўга, да трох ночы, не мог заснуць, прыкурваючы каля адчыненых дзвярэй балкона адну цыгарэту ад другой.

...Ранкам наступнага дня жонка баялася спускацца ў метро. Я настаяў, сказаўшы, што зараз гэта — самы бяспечны від транспарту. На ўваходзе нас сустрэлі металадэтэктары, байцы АМАПа... У вагонах было нязвыкла нешматлюдна для гэтага часу сутак... Калі праз некалькі дзён адкрылася «Кастрычніцкая», паказаў жонцы, як і куды выходзіў. На пероне яна ціхенька прайшлася ад таго месца, адкуль я выйшаў з вагона, да месца выбуху. Налічыла 15 невялікіх крокаў... Некаму для выратавання іх не хапіла... 11 красавіка я лічу сваім другім днём нараджэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■

■ Сталічныя хронікі

# МЯДЗВЕДЗЬ З ПІСТАЛЕТАМ І ЦАРСКАЯ НАСТОЙКА

## «Шопінг» 80 гадоў таму

**Часцей за ўсё пра тую ці іншую эпоху мы ведаем па самых значных гістарычных падзеях. Звесткі пра іх часам здаюцца сухімі, бывае цяжка ўявіць, што ў той час людзі гэтак жа радаваліся і сумавалі, хадзілі на працу і адпачывалі па выхадных, вячэралі ў кафэ і закупляліся ў крамах. Дарэчы, пра гэта. Цяпер савецкі час выразна асацыюецца з перыядам дэфіцыту, калі нічога нельга было дакупіцца. Хоць на самай справе ў тыя ж 1920—1930-я ў Мінску прадавалі тое, што нават зараз мы палічылі бы экзатычным...**

### Шахматы для весялосці

Вядома, акрамя падручнікаў гісторыі пагрузіцца ў тую ці іншую эпоху дапамагаюць мастацкія кнігі. Але ўсё ж прыходзіцца прызнаць, што канкрэтныя звесткі, як і падрабязнае апісанне побыту, у іх ёсць далёка не заўсёды. Каб даведацца, што ж дакладна прапаноўвалі сталічным спажыўцам у міжваенны перыяд, краязнаўца Вадзім ЗЕЛЯНКОЎ вывучыў узоры друкаванай рэкламы.

Вядома, такога багацця прамоўтарскай прадукцыі, якое ёсць цяпер, тады не было. Аднак барацьба за пакупніцкі попыт вялася актыўна. Так, у 1926 годзе быў выдадзены даведнік пад шматабяцальнай назвай «Увесь Мінск у кішэні». Праўда, разлічаны ён быў, хутчэй, не на простых спажыўцоў, а на буйных заказчыкаў. Бо рэкламаваліся не нейкія асобныя тавары або паслугі, а арганізацыі, якія іх прапаноўвалі. Напрыклад, калектыў чысцільшчыкаў, шчотачнікаў, металістаў, «Беларускі ларок», які аб'ядноўваў 25 мінскіх ларкоў.

У другой палове 1930-х унушальную падборку рэкламы можна было знайсці ў пачатку даведніка са спісам абанентаў мінскай АТС. Самую вялікую разнастайнасць тавараў прапаноўвалі тады, вядома ж, універмагі. Той жа Мінскі дзяржаўны паказальны ўнівермаг ці, прасцей кажучы, ГУМ. Размяшчаўся ён непадалёк ад цяперашняга, там дзе зараз правае крыло будынка КДБ. Даведнікі выпускаліся на беларускай мове, праўда, абрэвіятура не перакладалася, таму ГУМ меў аднолькавую назву на абедзвюх мовах, з часам менавіта гэты варыянт і прыжыўся. У даведніку рэкламаваўся не проста сам універмаг, а яго асобныя аддзелы. Усё гэта суправаджалася ілюстрацыямі вітрын, дарэчы, убачыць, як яны выглядалі, можна і цяпер. Супрацоўнікі ГУМа ў афармленні вітрын нярэдка звяртаюцца да рэтраматываў.

Менш буйныя, але таксама добрыя прамтаварныя крамы, знаходзіліся пераважна ў цэнтры. Дарэчы, не ўсе яны мелі дакладны адрас. Калі будынак стаяў на рагу вуліцы, то нумар яму не прысвойваўся, а так і пісалася — дом на рагу, напрыклад, Камсамольскай і Карла Маркса. Яшчэ адна асаблівасць таго перыяду, што назвы вуліц былі пераважна прыметнікамі, так цяперашняя вуліца Леніна тады называлася Ленінскай.

Адзін з самых вядомых гастраномаў знаходзіўся насупраць Дома ўрада, у доме Кастравіцкай, знесеным у 60-я. Многія ўжо пажылыя жыхары сталіцы, якія выраслі ў Мінску, да гэтага часу з захапленнем успамінаюць прысмакі, якія там прадаваліся. Дарэчы, смак іх можа быць знаёмы і нам. Бо тады ўжо працавалі фабрыкі «Камунарка», «Спартак»,» Чырвоны харчавік». А вось ласункі пад назвамі «шахар-накут», «бадам-безэ» і «гязь іспаганская», якія тады можна было, хоць і за немалую суму, раздабыць у Мінску, наўрад ці знойдуцца ў сталіцы цяпер.

Асартымент алкагольных напояў таксама ўражваў сваёй вытанчанасцю. Акрамя звыклых гарэлкі і віна, на паліцах можна было знайсці вялікі выбар лікёраў і настоек. У пашане была анісавая, якую ў Булгакава і Гайдая лічыў за найлепшую цар Іван Васільевіч, запяканка — гарэлка са спецыямі, кававы лікёр і лікёр з апельсінавай скуркі з прыгожай назвай кюрасо.

Калі мінчане не хацелі гатаваць самі, яны маглі адправіцца ва ўстанову грамадскага харчавання. Прыцягнуць наведвальнікаў спрабавалі не толькі хлебам, але і відовішчамі. Так, у фабрыцы-кухні, якая знаходзілася па адрасе Свярдлоўскі тупік, наведвальнікам прапаноўвалі шахматы, шашкі і більярд да дзвюх гадзін ночы.

### Сюрпрыз ад Пушкіна

Перад выхадам «у людзі» трэба было прыбрацца. У даваенны перыяд на тэрыторыі Беларусі развівалі ў першую чаргу лёгкую прамысловасць. Вопратку выраблялі, напрыклад, буйная фабрыка «Окцябр»— ідэалагічныя назвы акуратна транслітараваліся, гэта датычылася не толькі заводаў і фабрык, але і назваў вуліц і плошчаў. Вырабы прадпрыемства здаваліся ў арганізацыю з цяжкавымаўляльнай назвай Белшвейзабзбыт, а потым размяркоўваліся па ўсім Саюзе. Цяпер на месцы будынка прадпрыемства пракладаюць трэцюю лінію метро.

Вялікі попыт у той час быў і на футравыя вырабы, якія прапаноўваў Мехорг. Акрамя верхняга адзення выраблялі і галаўныя ўборы, якія ўжо практычна выйшлі з ужытку: фінку, гогаль, бандзейку, каптур. Акрамя дзяржаўных прадпрыемстваў існавала і велізарная колькасць арцеляў. Напрыклад, «Новы шлях» і «Амерыканка» — апошняя ніякага дачынення да змрочных падзей не мела, а назвалі яе так, хутчэй за ўсё, таму што была арганізавана па амерыканскім узоры. Арцелі праіснавалі вельмі доўга, аж да 60-х.

Што датычыцца касметычных сродкаў, то выбар іх быў у сотні разоў меншы, чым цяпер, затое назвы куды больш паэтычныя: знакамітая «Чырвоная Маска», «Новая зара», лініі «Любы сябар», «Квітнеючы май», сюрпрызная скрынка «Букет маёй бабулі». Больш за ўсё здзіўленне выклікае сюрпрызная скрынка да юбілею А. С. Пушкіна, бо ў 1937 годзе адзначалі дату —100 гадоў з дня яго смерці... Дарэчы ўжо тады вялікую ўвагу ўдзялялі яркасці і, як бы мы цяпер сказалі, «крэатыўнасці» візуальнага кантэнту ў гэтай сферы. Так, зубную пасту фірмы ТэЖэ рэкламавала жыццярадасная лётчыца.



Лялькі-рабочыя, 1930-я гады.

З таварамі для дзяцей усё было яшчэ складаней. Цацкі павінны былі не толькі пацешыць дзіця, але і, у першую чаргу, выхаваць яго ў ідэалагічна правільным рэчышчы, у духу савецкага патрыятызму. На першым плане былі ваенізаваныя цацкі, а таксама тыя, якія адлюстроўвалі будні савецкіх людзей. З пункту гледжання сучаснага, часта гэтыя імкненні даводзілі да абсурду. Так, на роўных з нацыянальнымі лялькамі, камсамолкай, вершнікам на кані і цалкам звыклымі транспартнымі сродкамі, як аўто хлебнае, аўто гоначнае ці лесавоз, вырабляліся цацкі, якія мелі афіцыйную назву: мядзведзь з пісталетам не афарбаваны; жанчына сячэ капусту, разьбяная цацка; грамадзянін у лодцы з вёсламі гумавы. Сустракаліся і проста пацешныя ўзоры: лялька баба разанская з вачыма, якія заплюшчваюцца; заяц №91 у трусіках, зусім маленькі; мужык-танцор; кошка ў запрэжцы; верабей №6 з падносам на драўлянай планцы; парася №1 у сукенцы ці трусіках; амерыканскі будаўнік афарбаваны; сабака, які скача, аздоблены заячым мехам з гумавым балонам-шыяй, і самы загадкавы аб'ект — качка інстытуцкая. А яшчэ кажуць, што гэта сёння можна купіць усё што заўгодна...

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

# «Баскетбол 3х3 — гэта заўсёды відовішча»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*— Менавіта таму ён збірае вялікую аўдыторыю. Да таго ж баскетбол 3х3 — гэта заўсёды відовішча. Паралельна са спаборніцтвамі праходзяць данкерскія шоу, заўсёды прысутнічае група падтрымкі і музычнае суправаджэнне. У многіх краінах трансляцыя баскетбола 3х3 становіцца значна больш папулярнай за трансляцыю класічнага баскетбола.*

Ужо некалькі гадоў у Мінску на «Палове-Арэне», якая размясцілася каля Палаца спорту, праходзяць спаборніцтвы па баскетболе 3х3 — турнір пад назвай «Палова», ён складаецца з чатырох этапаў, у кожным з якіх удзельнічаюць каля 100 камандаў, што таксама сведчыць аб немалой папулярнасці.

*— Улетку студэнты і школьнікі на гэтай арэне з самай раніцы да позняга вечара. Сёлета арганізатары агучылі ініцыятыву пашырыць узрост і пачаць з катэгорыі 12 гадоў, а не з 16, як было раней, таму што вельмі многія хочуць паспрабаваць сябе ў гэтым відзе спорту.*

### Гульцам не будзе замінаць ні дождж, ні сонца

У Мінска ўжо ёсць невялікі досвед правядзення міжнародных турніраў у гэтым напрамку баскетбола. У 2015 годзе сталіца прыняла чэмпіянат Еўропы сярод моладзі (U-18), дзе наша жаночая зборная заняла 2-е месца, а мужчынская — 4-е.

*— Можна сказаць, што гэта былі тэставыя спаборніцтвы для нас. Тады ніхто ў Беларусі яшчэ асабліва не ведаў, што такое баскетбол 3х3, людзі не бачылі гэты ўдасканалены*



Фота прадастаўлена БФБ.

*ад класічнага стрытбола. Трыбуны для гледачоў «Палова-Арэны» былі разлічаны на 650 пасадачных месцаў, але на матчах адначасова прысутнічала да 800 чалавек, гэта значыць, людзі хацелі глядзець баскетбол нават стоячы. Спаборніцтвы ў нашым відзе спорту ў рамках Еўрапейскіх гульняў пройдуць там жа. Вялікі плюс «Палова-Арэны» ў тым, што яна мае дах, гэта значыць мы абаронены ад нестабільных умоў надвор'я. Гульцам не будзе замінаць ні дождж, ні сонца. Цяпер прапрацоўваецца пытанне аб тым, каб павялічыць трыбуны да 1000—1500 месцаў.*

Ужо вядома, што ў турніры возьмуць удзел 16 мужчынскіх і 16 жаночых камандаў. Зборная Беларусі, як бок, што прымае спаборніцтвы, атрымала «White card», астатнім трэба будзе адбірацца па рэйтынгу, які будзе складзены на 1 лістапада 2018 года.

— Тады стануць вядомыя ўсе ўдзельнікі. Сетка правядзення спаборніцтваў ужо ёсць, мы працуем у шчыльным узаемадзеянні з ФІБА Еўропа, Дырэкцыяй па правядзенні спаборніцтваў, Міністэрствам спорту і турызму краіны і РЦАП па гульнявых відах спорту. Як паказаў вопыт правядзення такіх спаборніцтваў на Еўрагульнях у Баку і на Азіядзе-2017 у Ашхабадзе, спаборніцтвы па баскетболе 3х3 — гэта вячэрняя праграма.

### Баскетбол як хуткія шахматы

Анастасія Марыніна не хавае: вельмі хочацца, каб зборная Беларусі выступіла на Еўрагульнях годна, аднак сказаць, ці атрымаецца гэта, — складана, бо нашы каманды яшчэ ніколі не выступалі на такім высокім узроўні.

*— Калі ўсё складзецца паспяхова на Еўрапейскіх гульнях у Мінску, то можна будзе казаць і пра тое, каб весці падрыхтоўку нашых зборных і да Алімпійскіх гульняў. Зараз сумесна з Мінспортам і Рэспубліканскім цэнтрам алімпійскай падрыхтоўкі па гульнявых відах спорту вядзецца работа па стварэнні нацыянальных камандаў па баскетболе 3х3, дзе будзе свой склад гульцоў і трэнерскі штаб. Нам неабходна годна прадставіць краіну, а зрабіць гэта без належнай падрыхтоўкі, вядома, немагчыма. Сярод кандыдатаў у зборную ў першую чаргу будуць разглядацца гульцы з баскетбола 5х5. Але варта памятаць, што не кожны гулец класічнага баскетбола (нават паспяховы) падыходзіць для баскетбола 3х3, і наадварот. Усюды ёсць свая спецыфіка. 3х3 — гэта вельмі хуткі баскетбол, там трэба валодаць выдатным трохачковым кідком, бліскучай рэакцыяй. Калі ў класічным баскетболе вельмі каштоўныя высокія гульцы (у мужчын за 220 см, а ў жанчын за 195 см), то ў баскетболе 3х3 адыходзяць ад гэтых стандартаў, цэняцца гульцы сярэдняга росту і дужага целаскладу. Спартсмены, якія належным чынам могуць весці сілавую барацьбу на пляцоўцы, вылучаюцца высокай тэхнікай вядзення мяча, і гульцы, якія ўмеюць імкліва прымаць правільнае рашэнне і рабіць кідок у кальцо.*

### Спартсмены — па вынік, гледачы — па задавальненне

Анастасія Марыніна адзначае, што свае нюансы ёсць не толькі ў гульні, але і ў арганізацыі турніру, яна таксама будзе адрознівацца ад класічнага баскетбола 5х5.

*— 3х3 прасцейшы ў тым плане, што плошча меншая, відовішчнасць вышэйшая, але ў гэтай гульні, як я ўжо казала, дадаюцца моманты шоу. Напрыклад, работа дыджэя, на працягу ўсяго матча гучыць музыка — гучная, завадная, магчыма нават аўтарскія сэты дыджэяў. Гэта, вядома, недапушчальна ў класічным баскетболе, дзе ў цішыні мы чуем нават, як скрыпяць красоўкі па падлозе.*

У Мінск прыедуць найлепшыя гульцы Еўропы, кіраўнікі міжнароднай і еўрапейскай федэрацыі, наша задача правесці ўсё на высокім арганізацыйным узроўні. Стварыць добрыя ўмовы для работы прэсы, добрыя ўмовы для суддзяў, выдатныя ўмовы для гульцоў і камфортныя ўмовы для гледачоў. Каб яны добра правялі час усёй сям'ёй, купілі нейкую сувенірную прадукцыю. Бо спартсмены прыязджаюць па вынік, а гледачы прыходзяць атрымаць эстэтычнае задавальненне не толькі ад барацьбы на пляцоўцы, але і ад усяго антуражу вакол.

Ну і, вядома, не варта забываць, што любое правядзенне міжнародных спаборніцтваў (асабліва калі каманда выступае паспяхова) спрыяе прытоку дзяцей у секцыі. А гэта вельмі важна, таму што сучасныя дзеці лічаць за лепшае займацца гульнявымі відамі спорту, такімі як футбол, хакей і баскетбол, у камп'ютары. Там яны ўсе паспяхова выступаюць, а наша задача выцягнуць іх з віртуальнай рэальнасці ў звычайную, каб дзеці сапраўды займаліся спортам. Мы разумеем, што вельмі маленькі працэнт у будучыні стане прафесійнымі баскетбалістамі, але затое працэнт нашмат большы тых, хто будзе проста здаровым, арганізаваным, адказным і дысцыплінаваным.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# ВОСЕНЬ БУНДЭСТАГА

## Што абяцаюць парламенцкія выбары ў Германіі?




**Калі верыць вынікам апытанняў выбаршчыкаў, Ангела Меркель блізкая да таго, каб яшчэ на чатыры гады стаць кіраўніком урада Германіі. Але выбары ў бундэстаг, прызначаныя на 24 верасня, прыцягваюць увагу не толькі гэтым. Упершыню з заканчэння Другой сусветнай вайны ў нямецкім парламенце могуць аказацца дэпутаты ад шасці партый, у тым ліку ад правых нацыяналістаў. Акрамя таго, гэта першыя ўсеагульныя выбары пасля міграцыйнага крызісу 2015 года, калі ўрад Меркель абвясціў палітыку адчыненых дзвярэй у дачыненні да мігрантаў, у выніку чаго ў краіну прыбылі амаль мільён бежанцаў. Чаму важнае гэтае галасаванне?**

### БЕЖАНЦЫ Ў ТРЭНДЗЕ

Спачатку агульны расклад. У Германіі правам голасу валодаюць грамадзяне старэйшыя за 18 гадоў. Парламенцкія выбары праводзяцца кожныя чатыры гады па змяшанай прапарцыйнай і мажарытарнай сістэме. Кожны з прыкладна 61,5 млн выбаршчыкаў мае два галасы, а галасаванне на выбарах праходзіць па двух спісах. ФРГ падзелена на 299 выбарчых акруг, ад кожнай з якіх у бундэстаг выбіраецца па адным дэпутаце. Галасаванне па партыйных спісах праходзіць у 16 шматмандатных акругах. Кожная федэральная зямля ўяўляе сабой асобную шматмандатную акругу, ад якой абіраецца пэўная колькасць дэпутатаў у адпаведнасці з колькасцю насельніцтва. У кожнай шматмандатнай акрузе партыі прадстаўляюць асобныя партыйныя спісы. Іншымі словамі, партыя прадстаўляе 16 партыйных спісаў — па адным у кожнай акрузе (федэральнай зямлі). У цяперашніх выбарах удзельнічаюць 4828 кандыдатаў, з іх 29% — жанчыны. Толькі сярод «зялёных» і левых колькасць кандыдатаў-жанчын складае прыкладна палову. Самаму старому кандыдату 89 гадоў, самаму юнаму — 18.

Па выніках мінулых выбараў у парламенце засядалі чатыры партыі — традыцыйна кансерватыўны блок ХДС/ХСС, Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ), «Лінке» (левыя) і «зялёныя». На гэты раз колькасць партый у бундэстагу можа ўзрасці да шасці — акрамя «Альтэрнатывы для Германіі» (АДГ), добрыя шанцы на атрыманне дэпутацкіх мандатаў мае Свабодная дэмакратычная партыя. Увогуле ў выбарах бяруць удзел 34 партыі.

Падзея мае і еўрапейскі аспект. Германія адыгрывае вядучую ролю ў Еўрапейскім саюзе і ўносіць найбуйнейшы фінансавы ўклад у яго бюджэт. Падчас передвыбарчай кампаніі абмяркоўваецца ўвесь комплекс пытанняў — іміграцыі, дачы прытулку, інтэграцыі і дэпартацыі. Германскі навінавы сайт Focus нават скардзіўся, што гэтая тэма стала галоўнай падчас адзіных тэледэбатаў паміж Ангелай Меркель і яе галоўным супернікам — кіраўніком СДПГ Марцінам Шульцам. «Хіба ў краіны няма іншых праблем, акрамя праблемы бежанцаў?» — задаліся пытаннем журналісты сайта. Пры гэтым ацэнка Ангелы Меркель выбаршчыкамі амаль не змяняецца пад уздзеяннем спрэчак пра мігрантаў. Першапачатковa адчыніўшы дзверы сірыйскім бежанцам, урад затым заняў больш жорсткую пазіцыю, прыстрашыўшы масавымі дэпартацыямі — пасля таго як летась у Кёльне мігранты, пераважна выхадцы з краін Паўночнай Афрыкі, зладзілі шэраг групавых нападаў на мясцовых жанчын.

У перадвыбарчай кампаніі прысутнічалі і іншыя важныя тэмы — сацыяльная няроўнасць, дапамога, адукацыя і ўнутраная бяспека. Менавіта з-за гэтага сацыял-дэмакрат Марцін Шульц імкнуўся да абмеркавання тых тэм, як справядлівая аплата працы, павышэнне пенсій і паляпшэнне стану школ. Магчыма, гэта здзівіць, але выдаткі федэральнага бюджэту на адукацыю былі ў 2014 годзе ў Германіі ніжэйшыя, чым у сярэднім па ЕС.

### «ЯМАЙКА» ЦІ «СВЯТЛАФОР»?

Ці гарантаваная перамога Меркель? Стапрацэнтнай гарантыі няма, бо мільёны грамадзян Германіі пакуль не вызначылі сваёй пазіцыі. Як лічыць Марцін Шульц, тыя, хто вагаецца, могуць складаць амаль палову — да 46% выбаршчыкаў. Але, калі меркаваць па апытаннях, сацыял-дэмакраты адстаюць ад ХДС/ХСС на цэлых 14%, і наўрад ці Шульцу ўдасца прыцягнуць галасы тых, хто вагаецца. Ён не змог пераканаўча выступіць падчас тэледэбатаў, а яго патрабаванні паўторнай дуэлі з Меркель не атрымалі водгуку. Праблема сацыял-дэмакратаў яшчэ і ў тым, што на працягу апошніх чатырох гадоў яны ўваходзілі ў склад урадавай кааліцыі. Адзінай надзеяй Шульца застаецца раптоўнае змяненне настрою выбаршчыкаў напярэдадні выбараў. На карысць Меркель працуе тое, што эканоміка Германіі перажывае ўздым. ВУП краіны расце, урад атрымлівае больш даходаў у бюджэт, чым траціць.

Як жа зменіцца расклад улады? Марцін Шульц на словах адхіляе ідэю ўдзелу ў новай «вялікай кааліцыі» на чале з ХДС/ХСС, але ў Меркель ёсць і іншыя варыянты. Асноўных раскладаў прынамсі тры. Па-першае, чорна-жоўтая кааліцыя: ХДС/ХСС у саюзе з вольнымі дэмакратамі. Такая кааліцыя знаходзілася ў Германіі ва ўладзе з 2009 года да скрышальнай паразы лібералаў на выбарах 2013-га. Адраджэнне такога варыянта цалкам рэальнае пры ўмове, што абедзве партыі атрымаюць дастатковa месцаў у бундэстагу. Таксама магчымая чорна-чырвоная кааліцыя ў складзе ХДС/ХСС і СДПГ, якая кіравала ў Германіі ў перыяд 2005—2009 гадоў і з 2013-га. Згадваецца яшчэ і «ямайка» — па колерах ямайскага сцяга — у складзе ХДС/ХСС, свабодных дэмакратаў і «зялёных». Дарэчы, такая кааліцыя існуе ў зямлі Шлезвіг-Гольштэйн.

Калі сацыял-дэмакраты на чале з Марцінам Шульцам выступяць паспяхова, то ім спатрэбіцца падтрымка з боку «зялёных» і «Лінке», хоць адносіны сацыял-дэмакратаў з левымі даволі складаныя. Найбольш маляўнічай, але малаімавернай кааліцыяй стане «святлафор» — у складзе СДПГ, свабодных дэмакратаў і «зялёных». Цалкам спрыяльным раскладам для Шульца стане ўваходжанне ў новую кааліцыю з ХДС/ХСС на ўмовах сур'ёзных палітычных саступак з боку кіруючай большасці.



На палітычным гарызонце з'явіліся новыя асобы. Свабодныя дэмакраты, або лібералы, як іх яшчэ называюць, вярнуліся з забыцця пад кіраўніцтвам новага харызматычнага лідара, 38-гадовага Крысціяна Ліндхера, які падчас кампаніі абмяркоўваў у асноўным перспектывы развіцця адукацыі і новай лічбавай эканомікі. Яшчэ ў трох партыях пануе двоеўладдзе. Партыю «зялёных» узначальваюць цэнтрысты Катрын Герынг-Экардт і Джэм Эздэмір. Катрын звязаная з лютэранскай царквой, а Эздэмір заклікае Ангелу Меркель заняць больш жорсткую пазіцыю ў адносінах да Турцыі. На чале «Лінке» знаходзяцца Сара Вагенкнехт і Дытмар Барч, а на чале АДГ — Аліса Вайдэль і Аляксандр Гаўланд.

Як заўважаюць эксперты, у палітычным жыцці Германіі апошнім часам насамрэч адбываюцца буйныя перамены. Яно ўсё больш фрагментуецца, і ёсць рэальны шанц, што на будучых выбарах правая партыя «Альтэрнатыва для Германіі», якая выступае з антыісламскімі і антыімігранцкімі лозунгамі, можа заняць трэцяе месца ў бундэстагу па колькасці дэпутатаў, адзначае BBC. Пакуль што «Альтэрнатыва» прадстаўлена толькі на зямельным узроўні. Наколькі правай яна з'яўляецца? Міністр замежных спраў Зігмар Габрыэль казаў, што перад краінай паўстала перспектыва займець «сапраўдных нацыстаў у бундэстагу ўпершыню з заканчэння Другой сусветнай вайны». АДГ займае жорсткую антыімігранцкую і асабліва антыісламскую пазіцыю. Яна выступае за забарону мінарэтаў і лічыць іслам несумяшчальным з нямецкай культурай. Сустаршыня партыі Аляксандр Гаўланд заклікаў немцаў успомніць пра сваю гісторыю: «Мы маем права ганарыцца дасягненнямі германскіх салдат падчас дзвюх сусветных войнаў». Ён таксама выступіў з патрабаваннем выслаць міністра і камісара па справах іміграцыі і бежанцаў Айдан Азогус на радзіму яе бацькоў, у Турцыю. Летась Гаўланд заявіў, што не хацеў бы мець суседам чарнаскурага футбаліста.

У ходзе выбарчай кампаніі быў апублікаваны электронны ліст, нібыта за аўтарствам Алісы Вайдэль, у якім яна абразліва выказвалася ў адрас арабаў і цыган. Сама Вайдэль адмаўляе сапраўднасць гэтага дакумента. Іншы актывіст гэтай партыі Фраўке Петры ў 2016 годзе заявіла, што паліцыя ў выпадку неабходнасці павінна адкрываць агонь па мігрантах, якія спрабуюць нелегальна пранікнуць у Германію.

### БЕЗ РЭВАЛЮЦЫЙ

Паводле даных статыстыкі, пятую частку выбаршчыкаў Германіі складаюць пажылыя людзі, і, як лічаць аналітыкі, менавіта яны шмат у чым вызначаць расклад сіл у парламенце XIX склікання. Статыстыку галасавання прадстаўнікоў федэральны ўпаўнаважаны па правядзенні выбараў Дытэр Зарайтэр. «Сёння ўжо больш за 20% выбаршчыкаў — людзі ва ўзросце 70 гадоў і старэй», — паведаміў Зарайтэр. Практычна трэць — тыя, каму за 60. Па словах упаўнаважанага, менавіта гэтая група насельніцтва адыграе значную ролю для вынікаў галасавання. Да таго ж пажылыя людзі больш дысцыплінаваныя, яны з вышэйшай доляй імавернасці прыйдуць на выбарчыя ўчасткі, чым моладзь. Тых, каму няма 30, налічваецца толькі 16% (яшчэ ў 1980-м было 22%), а самыя юныя выбаршчыкі — ва ўзросце ад 18 да 21 года — складаюць і зусім невялікую долю ў агульнай колькасці — 3,6%. У ЦВК таксама адзначылі, што ўсё часцей людзі лічаць больш зручным галасаваць па пошце, а не асабіста прыходзіць на ўчасткі. Такая практыка была ўведзена ў 1957 годзе. Чакаецца, што сёлета тых, хто галасуе такім спосабам, будзе да 25% ад агульнай колькасці.

Дарэчы, на адных выбарах перамагла менавіта кааліцыя Меркель. Яны адбыліся ў Германіі 16 верасня. Гаворка ідзе пра «дзіцячыя выбары», якія традыцыйна арганізуюцца за тыдзень да правядзення парламенцкіх выбараў, піша Die Welt. Кожнае дзіця ці падлетак, які не дасягнуў 18 гадоў, незалежна ад грамадзянства, мог прагаласаваць за любую нямецкую палітычную партыю. «U18-Wahl», або па-іншаму «дзіцячыя выбары», прайшлі ў 1662 выбарчых участках па ўсёй Германіі, у «галасаванні» прынялі ўдзел больш за 215 тыс. дзяцей. 28,3% прагаласавалі за Саюз ХДС/ХСС. Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі атрымала 19,8% галасоў, партыя «Зялёныя» — 16,5%, «Левыя» — 8,1%, «Альтэрнатыва для Германіі» — 6,8%, Свабодная дэмакратычная партыя — 5,7%. Згодна з Канстытуцыяй ФРГ, узрост выбаршчыка не можа быць ніжэйшым за 18 гадоў, адпаведна, вынікі «дзіцячых выбараў» не будуць залічаны пры падліку галасоў на асноўных парламенцкіх выбарах. «U18-Wahl» праводзяцца для таго, каб выхоўваць у «будучых выбаршчыках» палітычную культуру, дадае Die Welt.

«Дзіцячыя выбары» на вынік не паўплываюць, аднак яны адлюстроўваюць агульную тэндэнцыю. Грамадзяне Германіі, падобна, аддаюць перавагу стабільнасці, якую ўвасабляе Меркель, асабліва ў сувязі з ростам папулісцкіх рухаў у іншых еўрапейскіх краінах. Як сказаў адзін палітычны каментатар, немцы не жадаюць палітычных рэвалюцый. Тым не менш самае цікавае — пасля выбараў, калі пачне фарміравацца ўрад і складвацца кааліцыі.




**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 1,5 кв. м (первый этаж, блок «А») по адресу г. Гродно, ул. Буденного, 37 |
| **Начальная цена продажи** | 5,70 р. (пять рублей семьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Размер ежемесячной арендной платы** | 5 базовых арендных величин |
| **Сумма задатка** | 0,57 р. (пятьдесят семь копеек) |
| **Условия аукциона** | целевое назначение арендуемых помещений – размещение вендингового аппарата |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 1,5 кв. м (второй этаж, блок «А») по адресу г. Гродно, ул. Буденного, 37 |
| **Начальная цена продажи** | 5,70 р. (пять рублей семьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Размер ежемесячной арендной платы** | 5 базовых арендных величин |
| **Сумма задатка** | 0,57 р. (пятьдесят семь копеек) |
| **Условия аукциона** | целевое назначение арендуемых помещений – размещение платежно-справочного терминала, инфокиоска, банкомата |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 8,6 кв. м (цокольный этаж, блок «А») по адресу г. Гродно, ул. Буденного, 37 |
| **Начальная цена продажи** | 70,68 р. (семьдесят рублей шестьдесят восемь копеек) с учетом НДС |
| **Применяемый коэффициент при расчете арендной платы** | в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его техническое состояние и коммерческой выгоды, в размере 3,0 |
| **Сумма задатка** | 7 р. (семь рублей) |
| **Условия аукциона** | целевое назначение арендуемых помещений – размещение склада, производственного помещения, офиса, оказание услуг, розничная торговля |
| **Продавец** | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичский вагонный участок, 225410, г. Барановичи, ул. Жлобинская, 21, Тел. 8-0163-49-24-00 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды) |
| **Срок заключения договора аренды** | Не позднее 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 24 октября 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 18 октября 2017 г. до 15.00**
**Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**http://grodnoino.by/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Комбайн свеклоуборочный Holmer Terra Dos T-2, зав. №192805, двигатель MAN D 2876 LE 103, объемом 12 817 см. куб., мощность 338 кВт/460 л. с, 2005 г. в |
| **Начальная цена продажи** | 143 280 р. (сто сорок три тысячи двести восемьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 14 328 р. (четырнадцать тысяч триста двадцать восемь рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | ЗАО «Гудевичи», 231626, Мостовский р-н, д. Гудевичи, ул. Мира, 4, тел. 8-01515-38716 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 23 октября 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 17 октября 2017 г. до 15.00**
**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**http://grodnoino.by/**

## Извещение о реализации имущества ОАО «Ошмяны-Лен» на третьих повторных торгах 4 октября 2017 года

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны, факс и электронная почта | Председатель ликвидационной комиссии – Ясюкайтис Михаил Чеславович ОАО «Ошмяны-Лен» Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Льнозаводская, 3, тел.: 80296772836; 80159343162; факс 80159345681; эл. почта: Oshmyany-len@yandex.ru |
| 2 | Форма проведения торгов. Дата, время и место проведения торгов | **Третьи повторные торги** в форме аукциона. 4 октября 2017 года в 12.00 по адресу: Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Льнозаводская, 3 |
| 3 | Сведения о предмете торгов, начальная цена продажи предмета торгов, место нахождения предмета торгов, порядок ознакомления с ним<br><br>**Цена в белорусских рублях, с НДС 20%** | **Начальная цена предметов торгов снижена на 45 %**<br>**ПРЕДМЕТЫ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ:**<br>**Лот 1.** Токарно-винторезный станок, инв. №0000080, 1981 г. в. – 1 191,96 рублей.<br>**Лот 10.** Погрузчик ПРМ-0.4 инв. №0000508, 2009 г.в. – 492,03 рублей.<br>**Лот 11.** Погрузчик ПРМ-0.4 инв. №0000509, 2009 г.в. – 492,03 рублей.<br>**Лот 12.** Погрузчик ПРМ-0.4 инв. №0000407, 2005 г.в. – 492,03 рублей.<br>**Начальная цена предметов торгов снижена на 50%.**<br>**ПРЕДМЕТЫ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ:**<br>**Лот 2.** Точильно-двухсторонний станок, инв. № 0000084, 1968 г.в. – 340,20 рублей.<br>**Лот 3.** Вертикально-сверлильный станок, инв. № 0000082, 1981 г.в. – 1 039,50 рублей.<br>**Лот 4.** Фрезерный широкоуниверсальный станок, инв. № 0000083, 1981 г.в. – 1 430,10 рублей.<br>**Лот 5.** Отрезной станок, инв. № 0000086, 1981 г.в. – 466,20 рублей.<br>**Лот 6.** Токарно-винторезный станок, инв. № 0000089, 1972 г.в. – 371,70 рублей.<br>**Лот 7.** Комбинированный станок (столярка), инв. № 0000085, 1986 г.в. – 837,90 рублей.<br>**Лот 8.** Станок для продольной распиловки леса, инв. № 0000092, 1972 г.в. – 415,80 рублей.<br>**Лот 9.** Семяочистительная машина СОМ-300, инв. № 0000410, 1985 г.в. – 693,00 рублей.<br>**Лот 13.** Бочка заправочной станции 50 м³, 1992 г.в. – 636,30 рублей.<br>**Лот 14.** Бочка заправочной станции 50 м³, 1992 г.в. – 636,30 рублей.<br>**Лот 15.** Вентилятор ВЦ-14-46-6,34, инв. № 0000448, 1999 г.в. – 315,00 рублей.<br>**Место нахождения имущества ЛОТОВ:** Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Льнозаводская, 3<br>Ознакомление с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. |
| 4 | Срок возможного отказа организатора от проведения торгов | Организатор вправе отказаться от проведения торгов в срок не позднее 29.09.2017 года, проинформировав участников торгов, подавших заявление об участии в торгах, об отказе в их проведении |
| 5 | Сумма шага аукциона | 5% – от начальной цены лота. |
| 6 | Начальная стоимость лота | Установлена: в рублях РБ с затратами на оценку и НДС – 20% |
| 7 | Порядок уплаты цены предмета торгов победителем торгов | Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в рублях РБ в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукционных торгов |
| 8 | Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего (расчетного) банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка | Размер задатка – 10% от начальной цены лота в рублях РБ.<br>Сумма задатка для перечисления:<br>**Лот 1.** – 119,19 рублей.<br>**Лот 2.** – 34,02 рублей.<br>**Лот 3.** – 103,95 рублей.<br>**Лот 4.** – 143,01 рублей.<br>**Лот 5.** – 46,62 рублей.<br>**Лот 6.** – 37,17 рублей.<br>**Лот 7.** – 83,79 рублей.<br>**Лот 8.** – 41,58 рублей.<br>**Лот 9.** – 69,30 рублей.<br>**Лот 10.** – 49,20 рублей.<br>**Лот 11.** – 49,20 рублей.<br>**Лот 12.** – 49,20 рублей.<br>**Лот 13.** – 63,63 рублей.<br>**Лот 14.** – 63,63 рублей.<br>**Лот 15.** – 31,50 рублей.<br>Получатель платежа: ОАО «Ошмяны-Лен» УНП 500117073, p\c BY21BAPB30124826100640000000 РКЦ №29 в г. Ошмяны ф-ла ОАО «БелАПБ» – ГОУ, БИК BAPBBY24457 ОКПО 003126044000.<br>**Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.**<br>Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению |
| 9 | Требования к участнику торгов | Возмещение победителем торгов расходов по оценке (включенных в начальную стоимость предмета торгов) и других расходов по проведению аукциона |
